# ЧАЛАВЕК І СВЕТ.
# Мая Радзіма –
# БЕЛАРУСЬ

**Падручнік**
**для 4 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі**
**з беларускай і рускай мовамі навучання**

2-е выданне, дапоўненае і выпраўленае

*Зацверджана Міністэрствам адукацыі*
*Рэспублікі Беларусь*

Мінск
Выдавецкі цэнтр БДУ
2013

Правообладатель Издательский центр БГУ

Издательский центр БГУ

УДК 974.6(075.2=161.3=161.1)
ББК 63.3(4Беи)я721
Ч-16

Аўтары:
С. В. Паноў, С. В. Тарасаў, І. А. Гімпель,
В. Л. Белая, А. В. Вольскі

Рэцэнзенты:
кандыдат педагагічных навук, дацэнт,
загадчык кафедры кіравання дзяржаўнай установы адукацыі
«Мінскі гарадскі інстытут развіцця адукацыі» М. А. Краснова;
метадычнае аб'яднанне настаўнікаў пачатковых класаў
дзяржаўнай установы адукацыі
«Міханавіцкая агульнаадукацыйная сярэдняя школа»
(настаўнік вышэйшай катэгорыі М. І. Пятровіч)

Издательский центр БГУ

## Умоўныя абазначэнні

? Пытанні

✎ Практычная работа

ISBN 978-985-553-064-1
© Афармленне. РУП «Выдавецкі цэнтр БДУ», 2013

Правообладатель Издательский центр БГУ

## ПАВАЖАНЫЯ ЮНЫЯ СЯБРЫ!

Мы з вамі адпраўляемся ў падарожжа па нашай краіне, імя якой — Беларусь. Падручнік «Чалавек і свет. Мая Радзіма — Беларусь» будзе суправаджаць вас у гэтым падарожжы. З дапамогай яго вы даведаецеся аб мінулым і сённяшнім сваёй краіны. Вы зможаце адказаць на шматлікія пытанні: хто былі нашы продкі? Па якіх законах яны жылі? У што верылі?

Гістарычная спадчына нашай краіны вельмі багатая. Пазнаёміцца з ёю вам дапамогуць апавяданні, змешчаныя ў гэтым падручніку.

## ЯК ПРАЦАВАЦЬ З ПАДРУЧНІКАМ

Уважліва чытайце апавяданні, разглядайце малюнкі і картасхемы. Гэта дапаможа вам лепш зразумець і запомніць самае галоўнае ў прачытаным.

Засяродзьце ўвагу на словах, якія выдзелены ў тэксце ***тлустым шрыфтам***. Запомніце, як яны вымаўляюцца і што абазначаюць. Абавязкова звярніцеся да тлумачэння гэтых слоў. Яны даюцца ў «Гістарычным слоўніку» ў канцы падручніка. Калі пры чытанні тэксту апавядання вам сустрэнецца незнаёмае слова, якога няма ў «Гістарычным

Издательский центр БГУ

слоўніку», звяртайцеся да настаўніка. Раім вам весці ў сшытку свой слоўнік, у які вы будзеце запісваць такія словы і іх тлумачэнні.

Гады вызначальных гістарычных падзей таксама вылучаюцца ў тэксце **тлустым шрыфтам**. Яны падаюцца ў адпаведным парадку ў канцы падручніка пад загалоўкам «Асноўныя гістарычныя даты».

У тэксце апавяданняў вы ўбачыце словы, абазначаныя *курсівам*. Гэта імёны гістарычных асоб і дзеячаў культуры, геаграфічныя назвы, назвы дзяржаў, розных устаноў, законаў, дзяржаўных свят, адзінкі вымярэння часу.

Кожнае апавяданне заканчваецца пытаннямі і заданнямі ці практычнай работай. Яны абазначаны ўмоўнымі знакамі. Абавязкова адкажыце на пытанні і выканайце заданні. Выкарыстоўвайце дапамогу настаўніка.

Ёсць у падручніку матэрыял, пададзены пад загалоўкам «Цікава ведаць». Тут змяшчаюцца звесткі, якія дапамогуць вам пашырыць свае веды.

Мінулае сваёй краіны вывучаюць не толькі па падручніку. Каб ведаць яе гісторыю, трэба самому цікавіцца ёю. Варта наведваць музеі, чытаць гістарычныя кніжкі. Прымаць удзел у экскурсіях і падарожжах па гістарычных мясцінах. Знаёміцца з гісторыяй сваёй сям'і, вёскі і горада, сваёй Радзімы.


Правообладатель Издательский центр БГУ

# 1. БЕЛАРУСЬ — МАЯ РАДЗІМА

Якая прыгожая назва ў нашай краіны — Беларусь!

А яшчэ мы завём яе — Радзіма.

А яшчэ — Бацькаўшчына.

***Радзі́ма*** — бо тут мы нарадзіліся, бо яна нам самая родная з усіх краін ва ўсім свеце.

Поле, лес, рэчка, возера, зямля, па якой мы ходзім, вёска ці горад, у якіх мы жывём, — гэта ўсё Радзіма.

Наша краіна завецца таксама ***Ба́цькаўшчына*** — бо яна засталася нам ад бацько́ў нашых. А ім ад іх бацькоў — нашых дзядоў. І так — аж ад самых далёкіх ***про́дкаў***.

Найвялікшы скарб Беларусі — гэта людзі. Вядомы беларускі пісьменнік Уладзімір



Правообладатель Издательский центр БГУ

Караткевіч пісаў пра іх так: «Жывы, разумны, працавіты і вольналюбівы беларускі народ! Беларус адрозніваецца шчодрасцю, гатоўнасцю заўсёды прыйсці на дапамогу ў бядзе».

Побач з беларусамі жывуць у нашых гарадах і вёсках рускія, палякі, украінцы, літоўцы, яўрэі, татары і прадстаўнікі іншых нацыянальнасцей. Усе мы жывём у ***Рэспу́бліцы Белару́сь***. Так завецца наша ***дзяржа́ва***.

Чаму ж нас называюць беларусамі, а нашу зямлю — Беларуссю? Адны кажуць, што ад белага колеру льняной вопраткі і светлых валасоў нашых жыхароў. Іншыя сцвярджаюць, што белая — значыць вольная. Сапраўды, белы колер ва ўсе часы быў сімвалам свабоднага жыцця.

***Гісто́рыю*** сваёй краіны трэба ведаць. Гэта дапаможа зразумець, як жылі людзі ў мінулым. Чым яны займаліся? Як баранілі сваю Радзіму? Як жывуць яны цяпер? Да чаго імкнуцца ў будучым?

?

**1.** Як называецца наша дзяржава?

**2.** Чаму нас называюць беларусамі, а нашу зямлю — Беларуссю?

**3.** Чаму мы называем Беларусь сваёй Радзімай і Бацькаўшчынай?

**4.** Чаму трэба ведаць гісторыю сваёй краіны?



Правообладатель Издательский центр БГУ

## 2. МЫ І НАШЫ СУСЕДЗІ

Наша краіна размяшчаецца ў самым цэнтры Еўропы. Тэрыторыя Беларусі — сярэдняя па велічыні сярод еўрапейскіх краін. Яе плошча складае больш за 207 тысяч квадратных кіламетраў. Працягласць з поўначы на поўдзень — 560 кіламетраў, а з захаду на ўсход на 90 кіламетраў большая, чым з поўначы на поўдзень.

Беларусь знаходзіцца на скрыжаванні еўрапейскіх транспартных шляхоў. Такое яе размяшчэнне спрыяе развіццю гандлёвых і культурных зносін з іншымі краінамі. А лёс нашага народа цесна пераплятаецца з лёсам народаў суседніх краін. Хто ж нашы суседзі? З Беларуссю мяжуюць *Расíя*, *Украíна*, *Пóльшча*, *Літвá* і *Лáтвія*. Самая вялікая мяжа ў нас з Расіяй. Яна складае амаль 1000 кіламетраў.

Тэрыторыя Рэспублікі Беларусь падзяляецца на шэсць абласцей: *Брэ́сцкую*, *Ві́цебскую*, *Гóмельскую*, *Грóдзенскую*, *Магілёўскую* і *Мíнскую*. Вобласці ў сваю чаргу падзяляюцца на раёны, а раёны — на сельскія саветы. Усе яны маюць сваё кіраўніцтва, якое клапоціцца аб паляпшэнні ўмоў жыцця людзей, развіцці гаспадаркі і павелічэнні багацця дзяржавы.

Усе багацці нашай краіны ствараюцца яе працавітымі, таленавітымі людзьмі. Колькі ж

Издательский центр БГУ




*Беларусь і яе суседзі*

нас, жыхароў Беларусі? У нашай рэспубліцы пражывае каля дзевяці з паловай мільёнаў чалавек, большая частка — у гарадах.

❓ **1.** Дзе размяшчаецца наша краіна?
**2.** З якімі краінамі мяжуе Беларусь?
**3.** Колькі жыхароў пражывае ў Беларусі?
**4.** Якая працягласць нашай краіны з захаду на ўсход?


Правообладатель Издательский центр БГУ

**5.** Чаму лёс нашага народа пераплятаецца з лёсам суседніх народаў?

1. Пакажыце на картасхеме «Беларусь і яе суседзі» (с. 8):
1) вобласць, у якой вы пражываеце;
2) межы Беларусі з суседнімі краінамі.
2. Даведайцеся пра колькасць насельніцтва ў вашым населеным пункце.

## 3. НАШЫ ПРОДКІ

Першы чалавек на тэрыторыі Беларусі з'явіўся ў далёкія-далёкія часы. Зямля, лясы і рэкі давалі яму прытулак і ежу. Ён паступова навучыўся рабіць каменныя, а потым



*Паляванне*

Издательский центр БГУ

Правообладатель Издательский центр БГУ 




*Рассяленне ўсходнеславянскіх плямён на тэрыторыі Беларусі*

жалезныя прылады працы. Людзям стала зручней апрацоўваць дрэва, скуру, будаваць жыллё. Жылі нашы далёкія продкі на берагах рэчак у лясных вёсачках. Яны палявалі на звяроў і аралі зямлю на невялікіх лапіках, якія адваявалі ў лесу.

З цягам часу на тэрыторыі Беларусі рассяліліся ўсходнеславянскія ***плямёны*** — групы людзей, якія мелі агульных продкаў, мову


Правообладатель Издательский центр БГУ



*Старажытнае паселішча*

і месца пражывання. Усходнія славяне — продкі сучасных беларусаў, рускіх і украінцаў. Землі, на якіх жылі нашы продкі, уваходзілі ў старажытнарускую дзяржаву. Яна называлася *Кі́еўская Русь*.

Згодна з ***пада́ннямі***, адно са шматлікіх славянскіх плямён з правадыром Кры́вам пасялілася на землях ад ракі Нёман да рэк Заходняя Дзвіна і Дняпро. Племя атрымала назву *крывічы́*. Лічаць, што такая назва паходзіць ад імя іх правадыра. А магчыма — ад слова «крэўныя» (гэта значыць — людзі, блізкія па крыві).

Частка крывічоў будавала сваё жыллё там, дзе Заходняя Дзвіна злівалася з рэчкай Палато́й. Жыхары тых мясцін сталі звацца палача́намі. Цяпер на гэтых землях знаходзяцца гарады Полацк і Віцебск.

Правообладатель Издательский центр БГУ

Крывічы мелі такі звычай. Калі юнак дасягаў паўналеццproperly, то, каб звацца сапраўдным мужчынам, ён павінен быў пераплысці паўнаводную раку, раскласці вогнішча, упаляваць звера. А таксама яму трэба было пералічыць сваіх продкаў да пятага калена. Таго, хто не мог усяго гэтага зрабіць, лічылі здольным да здрады і нават маглі выгнаць з племені.

Другое славянскае племя — *дрыгавічы́* — пасялілася на правым беразе Дняпра, у вытоку Нёмана і на Прыпяці. Яго прывёў сюды Дрыгаві́т. Гэта племя займала землі, дзе было шмат дрыгвяні́стых балот. Магчыма, адсюль паходзіць і назва «дрыгавічы». Тут быў пабудаваны старажытны горад Тураў.

На рацэ Сож пасялілася племя *радзі́мічаў*. Яны пачалі так звацца ад імя свайго правадыра Радзі́ма. Пазней на зямлі радзімічаў узнік горад Гомель.

Нашы продкі вылучаліся сілай і вынослівасцю. Яны займаліся жывёлагадоўляй, земляробствам. Тагачасныя земляробы сеялі жыта, пшаніцу, ячмень, лён, гарох, боб. Ураджай збіралі ўручную і сярпамі. Атрыманае зерне малолі на муку на каменных жорнах.

Жылі нашы продкі ў драўляных дамах. Елі простую ежу: хлеб, проса, грэчку, мяса, малако і мёд. Яны былі вельмі гасціннымі. А калі было неабходна, са зброяй у руках абаранялі свой дом.



Правообладатель Издательский центр БГУ



*Уборка ўраджаю*

У памяць аб супольным паходжанні братніх народаў — беларусаў, рускіх, украінцаў — мы абавязаны шанаваць нашу сумесную гісторыю.

**1.** Пералічыце назвы ўсходнеславянскіх плямён, якія лічацца продкамі сучасных беларусаў. Раскажыце, адкуль пайшлі іх назвы.
**2.** Раскажыце пра звычай, які існаваў у крывічоў. Што павінен быў зрабіць юнак, калі дасягаў паўналецця?
**3.** Чым займаліся нашы продкі? Чым яны харчаваліся? Дзе жылі?
**4.** Раскажыце, што вы ведаеце пра вашых бацькоў, дзядоў і прадзедаў.

Пакажыце на картасхеме (с. 10) тэрыторыю рассялення крывічоў, дрыгавічоў, радзімічаў.

Правообладатель Издательский центр БГУ

# 4. ЗЯМЛЯ БЛАКІТНЫХ РЭК І АЗЁР

Вы ведаеце, што ў Беларусі шмат розных рэк. Галоўныя рэкі Беларусі: *Дняпро́, Пры́пяць, Бярэ́зіна, Сож, Нёман, Захо́дняя Дзвіна́*. На іх берагах першапачаткова сяліліся нашы продкі. У час падарожжаў па рэках на лодках і караблях людзі абменьваліся рознымі рэчамі і прадуктамі харчавання. Большасць гарадоў былі пабудаваны на берагах рэк.

Ёсць сярод нашых рэк адна незвычайная. Гэта рака *Нямі́га*. У старажытным Мінску яна з'яўлялася ракой-вуліцай. Па ёй плавалі на чаўнах тагачасныя гарадскія жыхары. Раней Няміга была шырокая, а потым звузілася



*Рака Заходняя Дзвіна, якая працякае праз самы старажытны горад Беларусі — Полацк*


Правообладатель Издательский центр БГУ

і змялела. Сёння яна цячэ ў падземнай трубе пад вуліцай Няміга, што ў Мінску.

Калі рэкі — гэта блакітныя шляхі Беларусі, то азёры людзі ласкава называюць яе «блакітнымі вачамі». Самыя вялікія азёры — *На́рач, Асве́йскае, Чырво́нае, Луко́мскае, Дрыва́ты, Сві́цязь*. Амаль кожнае возера хавае мноства таямніц і загадак. Вось што расказвае паданне пра возера Свіцязь, што на Гродзеншчыне.

У даўніну з блакітных свіцязянскіх хваль чуўся людскі плач. Каб даведацца, хто так жаласна плача, рыбакі закінулі ў ваду сетку. Калі пачалі цягнуць яе ў лодку, з вады паказалася прыгожая дзяўчына з распушчанымі косамі.

«Ведайце, — сказала яна, — што возера заўсёды карае тых, хто адважыўся памуціць яго чыстыя воды. Але ў вашых жылах цячэ наша кроў, і таму я адкрыю вам таямніцу.

Калісьці тут, дзе вашы вёслы рассякаюць ваду, стаяў горад Свіцязь. Ім валодаў мой бацька. Аднойчы суседні гаспадар прыслаў майму бацьку пісьмо. У ім ён прасіў дапамогі. На яго напалі ворагі. Бацька сабраў сваіх воінаў. А перад паходам прыйшоў да мяне параіцца. Хто абароніць свіцязянскіх жанчын і дзяцей, калі ён не вернецца дамоў? Я супакоіла бацьку, сказала, што мне сніўся Бог. Ён міласэрны і абароніць нас ад бяды.

Издательский центр БГУ

Правообладатель Издательский центр БГУ 

Бацька рушыў у паход. Аднак ворагі разбілі наша войска і падышлі да Свіцязя. Тады ўсе жыхары яго пакляліся: памром, а не здадзімся ў палон! І раптам горад заліло асляпляльнае святло. Мы заплюшчылі вочы і пачалі падаць на зямлю. Але зямля расступілася пад намі, і замест яе нас прыняла вада».

Расказаўшы гэта, прыгажуня знікла. І больш яе ўжо ніхто не бачыў.

Той, хто хоць адзін раз ступіў на свіцязянскі бераг, абавязкова вяртаецца сюды. Ён жадае зноў убачыць «зоркі над сабою і зоркі пад сабою, і месяцы два побач з імі...». Гэтыя радкі напісаў славуты паэт Адам Міцкевіч, які нарадзіўся тут, на Навагрудчыне. Ён з любоўю ў сэрцы слухаў народныя песні і казкі, мясцовыя паданні. І прысвяціў сваім родным мясцінам, возеру Свіцязь, нямала вершаў.

**Цікава ведаць**

У старажытныя часы праз тэрыторыю Беларусі праходзіў вялікі гандлёвы шлях «з вара́гаў у грэ́кі». Рэкі Заходняя Дзвіна і Дняпро злучалі паміж сабой два моры: Балтыйскае і Чорнае. На берагах Балтыйскага мора жылі варагі — продкі сучасных шведаў, нарвежцаў, датчан. А праз Чорнае мора можна было нават трапіць на радзіму


Правообладатель Издательский центр БГУ




*Шлях «з варагаў у грэкі»*

Правообладатель Издательский центр БГУ



*На такіх караблях плавалі па шляху «з варагаў у грэкі»*

Алімпійскіх гульняў — у Грэцыю. Аднак на гэтым шляху была адна перашкода. Не існавала прамога воднага праходу ад Заходняй Дзвіны да Дняпра. Таму лодкі і караблі перацягвалі па зямлі.

У 18—19 стагоддзях на тэрыторыі Беларусі былі пабудаваны каналы. Яны дапамаглі стварыць адзіны водны шлях ад Балтыйскага да Чорнага мора. У наш час адноўлены Аўгустоўскі канал. З кожным годам яго наведвае ўсё больш турыстаў.

?

1. Якую ролю адыгрывалі рэкі ў старажытныя часы? Раскажыце пра адну з іх.
2. Чаму Нямiга — незвычайная рака?


Правообладатель Издательский центр БГУ

**3.** Чаму азёры называюць «блакітнымі вачамі» Беларусі?

**4.** Раскажыце, што ўразіла вас у паданні пра возера Свіцязь.

Падрыхтуйце вуснае паведамленне пра рэкі і азёры, якія знаходзяцца ў вашай мясцовасці.

## 5. НАША РАДЗІМА НА ГІСТАРЫЧНАЙ КАРЦЕ

Каб мець дакладнае ўяўленне пра тую ці іншую гістарычную падзею, варта ведаць месца і час, дзе і калі яна адбылася. Для гэтага нам спатрэбіцца гістарычная карта. Без яе немагчыма ўявіць тэрыторыю, на якой жылі нашы продкі. Немагчыма даведацца пра гандлёвыя шляхі і напрамкі ваенных паходаў.

Складаць карты людзі пачалі даўно. Яшчэ ў тыя часы, калі толькі-толькі адважваліся выбірацца за межы сваіх населеных пунктаў. На адной са старажытных карт былі пазначаны Мінск, Мазыр, Полацк, Віцебск, рэкі Прыпяць, Дняпро, Бярэзіна, Пціч. Узор такой карты вы можаце ўбачыць у падручніку.

Гістарычныя карты ствараюцца і сёння. На іх наносяцца не толькі гарады, якія існавалі ў старажытнасці. На гістарычных картах абазначаюцца назвы дзяржаў, іх межы,

Правообладатель Издательский центр БГУ




*Старажытная карта*


Правообладатель Издательский центр БГУ

пазначаецца мноства населеных пунктаў, вялікіх і малых рэк, а таксама гады гістарычных падзей.

Каб навучыцца «чытаць» гістарычную карту, неабходна ведаць наступныя правілы:

1) кожная карта мае сваю назву, якая адлюстроўвае пэўныя гістарычныя падзеі ў вызначаны час;

2) умоўныя абазначэнні на карце паказваюць напрамкі падарожжаў і ваенных паходаў, месцы бітваў і будаўніцтва замкаў-крэпасцей, сталіцы дзяржаў і межы паміж імі;

3) колеры выкарыстоўваюцца для абазначэння тэрыторый розных дзяржаў.

**1.** Для чаго патрэбна гістарычная карта?
**2.** Якія правілы трэба ведаць, каб «прачытаць» гістарычную карту?

1. «Прачытайце» адну з гістарычных карт, змешчаных у падручніку ці атласе. Звярніце ўвагу на ўмоўныя абазначэнні на картах.
2. Адзначце на контурнай карце месца вашага жыхарства.

## 6. СТУЖКА ЧАСУ

Для падарожжа ў мінулае нам трэба ведаць, які час называюць гістарычным. Калі цябе спытаюць: «У якім годзе ты пайшоў

Правообладатель Издательский центр БГУ




24 тысячы гадоў
да нашай эры

у школу?», то ты адкажаш так: «Я пайшоў у школу ў … годзе». А калі цябе спытаюць пра час, калі адбылася пэўная гістарычная падзея, то трэба будзе адзначыць не толькі год, але і стагоддзе. *Стаго́ддзе* — гэта сто гадоў. Тысяча гадоў, ці дзесяць стагоддзяў, складаюць *тысячаго́ддзе*. На пісьме для зручнасці стагоддзе абазначаецца скарочана *ст.*, а год — *г.*

Любую гістарычную падзею можна паказаць з дапамогай *сту́жкі ча́су*. Гісторыя — гэта і ёсць своеасаблівая стужка часу, дзе кожная падзея мае сваё месца — дакладную ***да́ту***.

У гісторыі вельмі часта сустракаецца паняцце ***э́ра***. Наша эра існуе ўжо два тысячагоддзі, або дваццаць стагоддзяў. Яе пачатак звязваюць з нараджэннем *Ісу́са Хрыста́*. Першы год яго жыцця з’яўляецца першым годам *на́шай э́ры*. Калі падзеі адбываліся да нараджэння Хрыста, то кажуць, што гэта адбылося *да на́шай э́ры*. Так, напрыклад, першыя

Издательский центр БГУ


Правообладатель Издательский центр БГУ




вядомыя ***стая́нкі*** старажытных жыхароў з'явіліся на тэрыторыі нашай краіны **каля 24 тысяч гадоў да нашай эры** (гэта дата прыкладная). Мы жывём у пачатку 21 стагоддзя. Гэта значыць, што пасля нараджэння Хрыста прайшло ўжо 20 стагоддзяў нашай эры, ці 2 тысячагоддзі.

Першай датай у гісторыі нашай краіны, якую мы ведаем дакладна, з'яўляецца **862 год**. Пад гэтым годам упершыню на старонках рукапісных кніг называецца старажытны горад Полацк.

Издательский центр БГУ

? **1.** Назавіце, якія адзінкі вымярэння часу ўжываюцца ў гісторыі.
**2.** Калі пачалася наша эра?
**3.** Дата якой падзеі з'яўляецца першай дакладна вядомай у гісторыі нашай краіны?

Намалюйце «стужку часу». Абазначце на ёй:
1) гады нараджэння сваіх бацькоў, бабуль і дзядуляў;

Правообладатель Издательский центр БГУ

2) год свайго нараджэння;
3) год, калі вы пайшлі ў школу;
4) год, у якім мы жывём;
5) год, калі вы скончыце школу.

## 7. МАЎКЛІВЫЯ СВЕДКІ МІНУЎШЧЫНЫ

Рукапісныя, а потым друкаваныя кнігі, у якіх пачала запісвацца гісторыя нашай краіны, умеюць гаварыць з намі сваёй мовай. Усе астатнія сведкі мінуўшчыны — маўклівыя. Іх трэба ўмець зразумець і па-свойму «прачытаць». Падобных маўклівых сведкаў вельмі многа. Сярод іх, напрыклад, камяні.

Шматлікія камяні пакінуў на нашай зямлі *ледаві́к*. З самымі вялікімі камянямі заўсёды былі звязаны розныя паданні. У мінулым людзі іх шанавалі, давалі імёны, прыносілі падарункі. Пашана да некаторых камянёў захавалася да нашых дзён.



*Рагвалодаў камень. 1171 год*

У Лю́банскім раёне Мінскай вобласці ёсць камень, які людзі назвалі Божым. Яго лічылі цудадзейным, а ваду, якая збіралася ў яго паглыбленнях, — лекавай. Да чара-


Правообладатель Издательский центр БГУ



*Музей валуноў у Мінску*

дзейнага каменя людзі часта прыносілі падарункі: хлеб, тканіну, грошы ці ягады. У каменя прасілі дапамогі, каб вылечыцца ад хваробы.

Вялікія камяні — з’ява рэдкая. Найбольшы з іх знаходзіцца ў Шумі́лінскім раёне Віцебскай вобласці. Яго даўжыня 11 метраў. Раней чалавек імкнуўся пакінуць на камені памяць пра сябе або пра важныя падзеі. Цяпер у Мінску створаны Музей валуноў. Тут знаходзяцца старадаўнія камяні, глыбы з надпісамі.

А яшчэ на нашай зямлі засталося шмат ***кургано́ў***. Гэта рознай вышыні земляныя пагоркі, якія насыпа́лі над старажытнымі пахаваннямі. Такіх курганоў у Беларусі налічваецца больш за 15 тысяч. Частку з іх

Правообладатель Издательский центр БГУ



*Курган каля вёскі Нялідавічы Мінскага раёна*

называюць курганамі-валатоўкамі. Згодна з паданнямі, у іх пахаваны ***во́латы*** — надзвычай дужыя і высокія людзі.

Звычай насыпаць курганы ўзнік вельмі даўно. Лічылася, што і пасля смерці жыццё чалавека працягваецца, толькі ў іншым месцы. Таму ў курганы нябожчыкам клалі ўсё тое, чым яны карысталіся пры жыцці: нож, сякеру, упрыгажэнні і іншыя рэчы. Калі нябожчык быў воінам — клалі меч, калі гандляром — ва́гі. У нагах ці галаве ставілі гаршчок з зернем або кашай, каб і на тым свеце ён мог падсілкавацца.

Пасля пахавання на насыпаным кургане заўсёды рабілі памі́нкі. Традыцыя ўспамінаць нябожчыка добрым словам пасля паха-


Правообладатель Издательский центр БГУ

вання дайшла і да нашых дзён. Вясной мы ўшаноўваем памяць сваіх продкаў на ***Ра́даўніцу***, а восенню — на ***Дзяды́***.

Камяні і курганы, а таксама розныя старажытныя прадметы побыту з'яўляюцца важнымі помнікамі гісторыі. Яны ахоўваюцца дзяржавай. Іх вывучэнне дапамагае даведацца аб жыцці і вераваннях нашых продкаў.

**Цікава ведаць**

Сярод камянёў, якія з'яўляюцца помнікамі гісторыі, вылучаюцца Барысавы камяні ў Полацку. У 12 стагоддзі полацкі князь Барыс загадаў высечы крыжы і выбіць надпісы: «Госпадзі, памажы рабу свайму Барысу» на вялізных валунах. Адзін з іх калісьці стаяў у рэчышчы Заходняй Дзвіны, непадалёку ад Полацка. Зараз яго перанеслі і паставілі побач з Сафійскім саборам. Гэты камень лічыўся святым. Вясной, калі вада ў рацэ спадала, да яго плавалі на лодках і клалі кавалачкі хлеба, прасілі добрага ўраджаю. Адсюль яго другая назва — Барыс-Хлебнік.



*Адзін з Барысавых камянёў*

Издательский центр БГУ

1. Чаму да некаторых камянёў старажытныя жыхары Беларусі ставіліся з пашанай? Свае адказы падмацуйце прыкладамі.
2. Чаму камяням і курганам часам давалі імёны?
3. Для чаго насыпалі курганы?
4. Раскажыце, як вы ўшаноўваеце памяць сваіх продкаў.

Даведайцеся ад дарослых, якія маўклівыя сведкі мінуўшчыны ёсць у вашай мясцовасці. Падрыхтуйце вуснае паведамленне.

## 8. ЯК ДА НАС ПРЫЙШЛА КНІГА

Аб жыцці продкаў у старажытныя часы нам паведамляюць ***ле́тапісы*** — пісьмовыя крыніцы. У іх запісвалі звесткі аб найбольш знач-




*Старонкі з летапісу*


Правообладатель Издательский центр БГУ
Издательский центр БГУ



*Летапісец*

ных падзеях. Самым старажытным летапісам усходніх славян з'яўляецца «Аповесць мінулых гадоў». Яна была напісана ў Кіеве.

Нашы продкі добра разумелі значэнне кнігі. Каля тысячы гадоў таму назад адзін з летапісцаў сказаў так: «Кнігі — гэта рэкі, якія напойваюць увесь Сусвет, ад іх зыходзіць мудрасць».

Кнігі ў даўнія часы былі толькі рукапісныя, вялікія і цяжкія. Пісаліся яны на тонка

Правообладатель Издательский центр БГУ



*Пераплёт (вокладка) рукапіснай кнігі*



*Старонка рукапіснай кнігі*

выробленай цялячай, авечай ці казінай скуры. Паперы тады яшчэ не было.

Загалоўкі і пачатковыя літары размалёўвалі фарбамі, упрыгожвалі малюнкамі. Пераплёт (вокладку) рабілі з дзвюх дошчачак. Іх абцягвалі скурай і аздаблялі каштоўнымі камянямі. Да пераплёту прымацоўвалі металічныя за́сцежкі, каб кнігу можна было зашпільваць.

Галоўнымі цэнтрамі перапісвання кніг у Беларусі былі старажытныя гарады *По́лацк* і *Ту́раў*.

У пачатку **12 стагоддзя** ў Тураве нарадзіўся хлопчык. Калі ён вырас, то стаў манахам і ўзяў імя Кірыла. Ён пачаў пісаць павучанні пра тое, як павінны жыць людзі.

Каб замаліць людскія грахі, *Кіры́ла Ту́раўскі* стаў пусто́льнікам. Ён добраахвотна


Правообладатель Издательский центр БГУ



*Кірыла Тураўскі*

Правообладатель Издательский центр БГУ

зачыніўся ў высокай ***ве́жы*** — абарончым збудаванні на беразе Прыпяці. Доўгія месяцы туды яму насілі толькі ваду і хлеб. У гэты час ён напісаў малітвы, якія вядомы і цяпер.

Кірыла Тураўскі заклікаў людзей любіць адзін аднаго. Сучаснікі называлі яго Златавустам. Многія яго кнігі дайшлі да нас. Яны сведчаць пра тое, што і ў старажытнасці Беларусь была багатая на таленты.

**Цікава ведаць**

Берасцяныя граматы, ці пісьмы, былі знойдзены вучонымі пры раскопках у Віцебску і Мсціславе. У старажытнасці пісьмы пісаліся на бяросце і на дошчачках, пакрытых тонкім слоем воску. Літары надрапваліся на бяросце ці выціскаліся на воску металічнымі палачкамі — піса́ламі. Ніжні канец пісала, якім выводзіліся літары, быў востры. Верхні меў форму лапатачкі. Ёю загладжваліся памылкі на воску.



*Берасцяная грамата з Віцебска*



*Старажытныя пісалы*



Правообладатель Издательский центр БГУ

1. Пра што расказваюць нам летапісы? Які з іх з'яўляецца самым старажытным?
2. Назавіце гарады, якія былі галоўнымі цэнтрамі перапісвання кніг.
3. На чым пісалі пісьмы нашы продкі?

Падрыхтуйце вуснае паведамленне пра Кірылу Тураўскага.

## 9. ПЕРШЫЯ ДРУКАВАНЫЯ КНІГІ

Мінула шмат стагоддзяў, пакуль у Беларусі з'явілася першая друкаваная кніга. Пачынальнікам кнігадрукавання сярод усходніх славян стаў *Францы́ск Скары́на*.

Нарадзіўся Скарына ў канцы 15 стагоддзя ў Полацку. Пачатковую адукацыю атрымаў у сваім родным горадзе. Потым вучыўся ў польскім горадзе Кра́каве і італьянскім горадзе Па́дуі.

Стаўшы выдатным вучоным, Скарына вырашыў узяцца за друкаванне кніг на старабеларускай мове. На Радзіме ўмоў для друкавання не было, і ён паехаў у чэшскі горад Прагу. Тут у **1517 годзе** выйшла ў свет першая друкаваная кніга, выдадзеная Скарынам. Пазней ён перавёз сваю друкарню на Радзіму, дзе прадоўжыў любімую справу.

Пры афармленні кніг Скарына шырока выкарыстоўваў ілюстрацыі. Асобныя літары

Издательский центр БГУ

Правообладатель Издательский центр БГУ



*У старажытнай друкарні*

алфавіта, з якіх пачынаўся тэкст, ён упрыгожваў пэўнымі малюнкамі, каб лягчэй запаміналася. Каля «К» — казлянятка, каля «З» — звер, каля «Л» — лён. А да літары «Я» Скарына намаляваў свой партрэт.

Францыску Скарыне часта даводзілася пераязджаць з краіны ў краіну, з горада ў горад. Але ён ніколі не забываўся пра сваю Радзіму. У адной з кніг Скарына пісаў: «Звяры, якія жывуць у пустынях, ад нараджэння ведаюць свае норы. Птушкі, якія лятаюць у паветры, ведаюць свае гнёзды. Рыбы, якія плаваюць у морах і рэках, чуюць свае віры. Пчолы і ім падобныя бароняць свае вуллі. Так і людзі да таго месца, дзе нарадзіліся і выраслі, вялікую любоў маюць».


Правообладатель Издательский центр БГУ


Издательский центр БГУ

*Францыск Скарына*

Правообладатель Издательский центр БГУ


БИВЛИЯ РУСКАЯ
ВЫЛОЖЕНА ДОКТОРОМЪ
ФРАНЦИСКОМЪ СКОРИНОЮ
ИЗСЛАВНАГО ГРАДА ПО
ЛОЦЬКА, БОГУ КЧТИ И
ЛЮДЕМЪ ПОСПОЛИТЫМЪ
КДОБРОМУ НАУЧЕНИЮ

*Тытульны ліст кнігі «Біблія», выдадзенай Францыскам Скарынам у Празе*


Правообладатель Издательский центр БГУ

Прыкладам уласнага жыцця Францыск Скарына паказаў, як трэба любіць свой народ і шанаваць матчыну мову. У цэнтры сучаснага горада Полацка ўзвышаецца помнік знакамітаму беларускаму першадрукару.

Прадаўжальнікам справы Скарыны стаў вядомы беларускі друкар і вучоны *Сымо́н Бу́дны*. Як і Скарына, ён быў вельмі адукаваным чалавекам, валодаў многімі мовамі. У 1562 годзе Будны выдаў на беларускай мове кнігу аб хрысціянскай веры. Яна была надрукавана ў Нясвіжы. Сымон Будны лічыў, што ўсе людзі, багатыя і бедныя, павінны быць роўнымі перад законам і жыць у міры. А калі неабходна, то трэба бараніць сваю Радзіму.

Сёння ў Нясвіжы побач з былой друкарняй стаіць помнік Сымону Буднаму. Друкар горда




*Помнік Сымону Буднаму ў Нясвіжы*

Правообладатель Издательский центр БГУ

трымае ў адной руцэ кнігу, нібы запрашае яе пачытаць.

**Цікава ведаць**

Кнігі, выдадзеныя Францыскам Скарынам, былі добра вядомы не толькі ў Беларусі. Яны сталі ўзорам для далейшага развіцця друкарства ў Маскве і ва Украіне. Гэту справу ў Маскве прадоўжылі друкары Іван Фёдараў і Пётр Мсцісла́вец.

**1.** Назавіце імя і прозвішча пачынальніка кнігадрукавання сярод усходніх славян.
**2.** Што пісаў Францыск Скарына пра сваю Радзіму?
**3.** Раскажыце, якімі, на думку Сымона Буднага, павінны быць адносіны паміж людзьмі.

Падрыхтуйце вуснае паведамленне пра жыццё і дзейнасць Францыска Скарыны.

## 10. КНЯЗЁЎНА З ТРЫМА ІМЁНАМІ

Апрача чалавека, ніхто з жывых істот не цікавіцца сваім паходжаннем, справамі сваіх продкаў. Шмат што забылася на свеце, а сумны лёс полацкай князёўны *Рагнéды* застаўся ў народнай памяці, жыве ў паданнях. Вось адно з іх.


Правообладатель Издательский центр БГУ



*Рагвалод і Рагнеда*

Правообладатель Издательский центр БГУ

Даўным-даўно, у 10 стагоддзі, у сям'і полацкага ***кня́зя*** Рагвало́да нарадзілася дачка, якую назвалі Рагнедай. Калі князёўне споўнілася чатырнаццаць гадоў, пасваталіся да яе два браты. Гэта былі вялікі кіеўскі князь Крапо́лк і наўгародскі князь Уладзімір. Браты паміж сабой не сябравалі.

Наспявала вайна. Браты разлічвалі, што полацкі князь дапаможа сваім войскам таму з іх, хто стане мужам яго дачкі. Рагнедзе спадабаўся Яраполк, а Уладзіміру яна са згоды бацькі адмовіла. Сваты раз'ехаліся: адны з радаснай весткай у Кіеў, другія — з сумнай весткай у Ноўгарад. Рагнеда чакала лета, калі да яе, па звычаях таго часу, павінен быў прыехаць жаніх.

Ды лёс вырашыў іначай. Уладзімір сабраў вялікае войска і, як толькі сышоў снег, нечакана напаў на Полацк. Бацькі і браты Рагнеды былі забіты. А князёўну Уладзімір сілай прымусіў стаць сваёй жонкай. Пасля гэтага Уладзімір з войскам рушыў на Кіеў, перамог Яраполка і стаў вялікім кіеўскім князем. А Рагнеда стала вялікай княгіняй у Кіеве.

Згодна са старадаўнім звычаем, жанчына, калі выходзіла замуж, мяняла імя. Рагнеда назвалася *Гарысла́вай*. У яе нарадзіліся чатыры сыны і дзве дачкі. Але памяць пра бацьку, маці, братоў не давала спакою. І Рагнеда вырашыла адпомсціць за родных.


Правообладатель Издательский центр БГУ



*Рагнеда і Ізяслаў*

Правообладатель Издательский центр БГУ

Аднойчы ноччу падышла яна да ложка, дзе спаў Уладзімір, з намерам яго забіць. Але князь прачнуўся, ускочыў і ў лютасці схапіўся за меч. На шум прыбег старэйшы сын *Ізясла́ў*. Ён засланіў маці і сказаў: «Бацька, раней забі мяне!»

Князь супакоіўся, а назаўтра абвясціў наступнае. Малодшых дзяцей Рагнеда не ўбачыць ніколі. А са старэйшым паедзе пад Мінск, у невялікую крэпасць, якую ён дарує сыну Ізяслаў. Ад яго імя і пайшла назва крэпасці, а пазней і горада. Цяпер гэта горад Заслаўе, што пад Мінскам.

Уладзімір тым часам прыняў хрысціянства (веру ў Ісуса Хрыста) і пачаў хрышчэнне насельніцтва ва ўсіх гарадах. Рагнеда пастрыглася ў манашкі пад імем *Анастасі́і*. А Ізяслаў стаў полацкім князем.

Сёння тыя, хто наведвае старадаўняе Заслаўе, прыходзяць да месца, дзе жыла Рагнеда. Яны аддаюць пашану памяці полацкай князёўны-пакутніцы, якая пражыла свой век пад трыма імёнамі.

? **1.** Раскажыце пра жыццёвы шлях князёўны Рагнеды.

**2.** Чаму полацкая князёўна пражыла сваё жыццё пад трыма імёнамі?

✎ Падрыхтуйце вуснае паведамленне пра тое, адкуль пайшла назва горада Заслаўе.


Правообладатель Издательский центр БГУ

# 11. СЫН РАГНЕДЫ — ЯРАСЛАЎ МУДРЫ

Больш за тысячу гадоў таму назад князі ўсходніх славян стварылі старажытнарускую дзяржаву — Кіеўскую Русь. Галоўным горадам дзяржавы, яе сталіцай, быў Кіеў. У ім жылі вялікія князі. Адным з самых вядомых князёў быў *Яраслáў* — сын Рагнеды. За свой розум ён быў празваны Мудрым. Пры ім пачалі пісаць летапісы і перапісваць царкоўныя кнігі. Спачатку Яраслаў княжыў у Ноўгарадзе. Горад у той час быў буйным гандлёвым цэнтрам, куды з'язджаліся купцы з усяго свету. Яраслаў будаваў масты і дарогі, умацоўваў крэпасці.

Пасля смерці бацькі Яраслаў стаў вялікім кіеўскім князем. Час княжання Яраслава быў вяршыняй славы і велічы Кіеўскай Русі. Ён напісаў першы агульны для ўсіх ***закóн*** — *«Рýскую Прáўду»*. Гэты закон стаў правілам жыцця для насельніцтва Кіеўскай Русі, у тым ліку і жыхароў беларускіх зямель. Для тых, хто парушаў закон, былі прадугледжаны пакаранні: ад штрафаў да смяротнай кары.

Яраслаў быў супраць княжацкіх сварак за землі і багацце. Ён лічыў, што аб'ядноўваць дзяржаву трэба не толькі з дапамогай зброі, але і верою ў Хрыста. Па яго загадзе ў цэнтры

Правообладатель Издательский центр БГУ



*Яраслаў Мудры*



Правообладатель Издательский центр БГУ

Кіева быў пабудаваны велічны ***сабóр*** у імя святой Сафіі. Гэта быў самы вялікі і прыгожы храм Кіеўскай Русі ў **11 стагоддзі**. Падобныя храмы былі пабудаваны ў Полацку і Ноўгарадзе.

Яраслаў Мудры быў таксама ўдалым военачальнікам. Ён неаднойчы перамагаў ворагаў на полі бою. У час яго княжання ворагі баяліся нападаць на Кіеў і іншыя гарады княства.

Яшчэ да сваёй смерці Яраслаў падзяліў Кіеўскую Русь паміж сынамі. Ён загадаў ім кіраваць разумна і не сварыцца паміж сабою. Так і было некаторы час. Аднак потым забыліся сыны пра бацькаў наказ. Гэтым яны наклікалі на краіну розныя беды. У 13 стагоддзі Кіеўская Русь была амаль цалкам захоплена і разрабавана войскамі, якія прыйшлі з далёкай Азіі.

Памяць аб Яраславе Мудрым як разумным і разважлівым дзяржаўным дзеячы жыве і сёння.

?
**1.** Чаму Яраслаў быў празваны Мудрым?
**2.** Які закон вызначаў правілы жыцця для ўсіх жыхароў Кіеўскай Русі?
**3.** У якіх гарадах былі пабудаваны Сафійскія саборы?
**4.** Што загадаў Яраслаў Мудры сваім сынам?
**5.** Чаму памяць аб Яраславе Мудрым захавалася да нашых дзён?

Правообладатель Издательский центр БГУ

# 12. УСЯСЛАЎ ЧАРАДЗЕЙ

У краі блакітных азёр, у горадзе Полацку, правіў князь *Усясла́ў*. Чуткі аб ім хадзілі па ўсім белым свеце.

Гаварылі людзі пра Усяслава рознае. То ваўком, бывала, абернецца, то турам, то сокалам. Аббягаў ён ды аблятаў межы свайго княства, даглядаючы яго і ахоўваючы ад ворагаў. За гэта Усяслава і празвалі Чарадзеем.

Прыязджалі ў Полацк гандляры з Кіева і Ноўгарада. Прыходзілі воіны, каб папоўніць ***дружы́ну*** полацкага князя.

Народнае паданне апавядае, што сабраў малады князь аж сем тысяч воінаў. І ўсе маладыя, ды і самому княжычу было тады пятнаццаць гадоў.

Мацаваў Усяслаў горад, а з ім і ўсю Полацкую зямлю. Пабудаваў у Полацку новы вялікі замак. Абнёс яго высокай драўлянай сцяной. Абкапаў глыбокімі рава́мі. Не пераскочыць, не пералезці. У самім жа замку дзіва паўстала — сабор у імя святой Сафіі, як у Кіеве і Ноўгарадзе.

А калі княству пагражала небяспека, Усяслаў вымаў свой меч і смела кідаўся ў бой. Так было ў сакавіку **1067 года**, калі адбылася бітва на рацэ Нямізе. Аб гэтым старажытны паэт пісаў:



Правообладатель Издательский центр БГУ



*Усяслаў Чарадзей*

Правообладатель Издательский центр БГУ

На Нямізе снапы сцелюць галовамі,
Жалезнымі малоцяць цапамі,
Жыццё кладуць на таќу злюцéла,
Веюць душу ад цела...

Пражыў Усяслаў Чарадзей больш за семдзесят гадоў. Пры яго жыцці Полацкае княства дасягнула найбольшага росквіту і праславілася сярод іншых дзяржаў.



*Полацкі Сафійскі сабор*


Правообладатель Издательский центр БГУ




Правообладатель Издательский центр БГУ

1. Раскажыце, чаму полацкага князя Усяслава празвалі Чарадзеем.

2. Раскажыце пра дружыну полацкага князя.

1. Карыстаючыся малюнкам на с. 48, апішыце сабор святой Сафіі ў Полацку. Выкарыстоўвайце словы: *велічны, купалы, крыжы*.

2. Апішыце старажытную зброю, карыстаючыся малюнкамі на с. 49.

## 13. ЕФРАСІННЯ ПОЛАЦКАЯ

Велічны звон склікае палачан на плошчу каля Сафійскага сабора на сход. Сюды сыходзяцца дарослыя мужчыны, гатовыя стаць пад княжацкія сцягі і бараніць сваю зямлю ад ворагаў. Князь на людскі натоўп пазірае, думу думае. Час у паход выступаць.

А па вузенькіх вулачках горада спяшаецца дзяўчынка гадоў дзесяці. Гэта *Прадсла́ва*. Ідзе хутка і ўпэўнена — горад ёй добра знаёмы. Праз хвіліну дзяўчынка ўжо каля сабора. Тут лечаць параненых воінаў. З раніцы да вечара дапамагае Прадслава. Каму вады паднясе, каму слова ласкавае скажа...

Мінулі гады. Падрасла прыгажуня Прадслава. Бацька надумаў аддаць яе замуж. Але яна вырашыла інакш. Сышла ў манастыр, каб


Правообладатель Издательский центр БГУ



*Ефрасіння Полацкая*

прысвяціць сваё жыццё Богу і бедным людзям. Маладой манашцы далі новае імя — *Ефрасі́ння*. Спачатку яна жыла ў Сафійскім саборы. Чытала і перапісвала кніжкі, якія потым прадавалі. А грошы раздавалі бедным. Мана-

Правообладатель Издательский центр БГУ

стыры сваім набыткам дзяліліся з беднымі людзьмі, давалі прытулак падарожным.

У тыя далёкія часы дзеці навучаліся або дома, або ў школах пры манастырах і цэрквах. Ефрасіння вучыла дзяўчынак чытаць і пісаць, рабіць розныя хатнія справы: шыць, гатаваць ежу, вышываць.

Слава аб дабрадзейнасці Ефрасінні разышлася далёка за межы Полацка. Ведалі яе і ў Кіеве, і ў Ноўгарадзе. Людзі дзякавалі за дабро, якое яна рабіла для іх. Ефрасіння вучыла людзей паважаць адзін аднаго, заклікала спыніць крывавыя войны. Зброя, казала яна, прыносіць у хаты замест хлеба горыч ды слёзы.

Колькі пражыла Ефрасіння, дакладна ніхто не ведае. Але добрая памяць аб ёй засталася на зямлі. Яна стала першай жанчынай сярод усходніх славян, якую царква абвясціла святой. А ў Полацку, недалёка ад ракі



*Выява святой у Спаса-Ефрасіннеўскай царкве*


Правообладатель Издательский центр БГУ

Палаты́, і па сённяшні дзень стаіць прыгожая, нібыта лялечная, царква, пабудаваная па жаданні князёўны-манашкі. Гэту царкву людзі завуць *Спа́са-Ефрасі́ннеўскай*.

У кожнага народа ёсць святыні, якімі мацней за жыццё даражылі мудрыя продкі. Для беларускага народа такой святыняй з'яўляецца крыж, які зрабіў у 1161 годзе майстар *Ла́зар Бо́гша* па заказе Ефрасінні Полацкай. Паданне сведчыць, што крыж свяціўся, хворым вяртаў здароўе, знясіленым — надзею на лепшае жыццё.

У пачатку Вялікай Айчыннай вайны, у 1941 годзе, крыж знік. Дагэтуль невядома, дзе ён знаходзіцца. Сучасны брэсцкі майстар Мікалай Кузьміч аднавіў вобраз святога крыжа. Ён быў урачыста ўскладзены ў Спаса-Ефрасіннеўскай царкве. Тут жа захоўваюцца і мо́шчы (астанкі) святой Ефрасінні. А пошукі сапраўднага крыжа працягваюцца.

**Цікава ведаць**

**1.** Аснова Крыжа Ефрасінні Полацкай зроблена з кіпарысавага дрэва. Вышыня крыжа 51 сантыметр. Да драўлянай асновы крыжа былі прымацаваны залатыя пласціны з намаляванымі выявамі святых, каштоўныя камяні. У спецыяльных гнёздах знаходзіліся хрысціянскія каштоўнасці.

Издательский центр БГУ



*Крыж Ефрасінні Полацкай*



*Спаса-Ефрасіннеўская царква*

Гэта кроплі крыві Ісуса Хрыста і кавалачак ад драўлянага крыжа, на якім яго распялі. Па баках крыж быў упрыгожаны пазалочанымі срэбнымі пласцінамі.

**2.** Спаса-Ефрасіннеўская царква казачнай прыгажосці. Яе пабудавалі вельмі хутка — за 30 тыдняў. Яна нагадвае белую птушачку, якая нібыта адпачывае на зялёным лузе. Царква пабудавана так, што быццам бы імкнецца ў неба. Унутры царквы сцены распíсаны дзівоснымі малюнкамі, якія захаваліся да нашых дзён.



Правообладатель Издательский центр БГУ

1. Чаму маладая палачанка Прадслава пайшла ў манастыр?

2. Якой высакароднай справай займалася Ефрасіння?

3. Раскажыце пра жыццёвы шлях Ефрасінні Полацкай. Якую памяць яна пакінула аб сабе?

4. Які крыж з'яўляецца святыняй для беларускага народа?

1. Карыстаючыся малюнкам і тэкстам апавядання, апішыце крыж Ефрасінні Полацкай.

2. Апішыце па фотаздымку Спаса-Ефрасіннеўскую царкву. Выкарыстоўвайце словы: *прыгожая, нібыта лялечная, белакаменная, купал*.

## 14. У АБАРОНУ СВАЁЙ ЗЯМЛІ

Ледзяныя вятры з поўначы ды гарачыя з поўдня наганялі хмары на блакітныя нябёсы Полацкага княства. На нашы землі напалі ***ры́цары***-крыжакі́. Яны рабавалі гарады і вёскі, забіралі людзей у палон. Супраць крыжацкай пагрозы аб'ядналіся многія славяне і ба́лты. (Балты — гэта продкі сучасных літоўцаў і латышоў.) Так у **13 стагоддзі** быў пакладзены пачатак аб'яднанню беларускіх і літоўскіх зямель у адну дзяржаву — *Вялі́кае*

Правообладатель Издательский центр БГУ



*Крыжакі пад Навагрудкам*

*Кня́ства Літо́ўскае*. Яе цэнтрам першапачаткова стаў горад *Навагру́дак*.

Барацьбу супраць крыжакоў узначаліў вялікі князь *Ві́таўт*, які стаяў на чале княства. З малых гадоў Вітаўт вучыўся трымаць у руках зброю, сядзець на кані, што спатрэбілася яму ў далейшым. У гады яго кіравання дзяржава дасягнула сваёй найбольшай велічы і магутнасці.

**У 1410 годзе** Вітаўт павёў свае войскі на нямецкіх рыцараў. Гэта адбылося 15 ліпеня


Правообладатель Издательский центр БГУ



*Вялікі князь Вітаўт*

каля вёскі *Гру́нвальд* (што азначае «зялёны лес» ці «гай»). Вялікі князь Вітаўт разам са сваім братам, польскім каралём Ягáйлам, пачалі бітву з крыжакамі. Праціўнікі сышліся

Правообладатель Издательский центр БГУ

ў смяротным паядынку. Трава пачырванела ад крыві. Іскры сыпаліся з мячоў і шчытоў. Ламаліся коп'і. Падалі параненыя воіны пад капыты коней.

Бітва працягвалася ўвесь дзень. Пад вечар крыжакі не вытрымалі. Яны пачалі адыходзіць. А неўзабаве і пабеглі, ратуючыся ад пагібелі і палону.

Дзякуючы мужнасці беларусаў, рускіх, літоўцаў, палякаў і татараў крыжакі былі разбіты.

Шмат гадоў мінула з таго часу. Аднак і дагэтуль мы ўшаноўваем памяць мужных воінаў, якія перамаглі ворагаў у цяжкай бітве пад Грунвальдам.

**1.** Як называлася дзяржава, у якую аб'ядналіся беларускія і літоўскія землі? Чаму яна ўзнікла? Які горад першапачаткова стаў яе цэнтрам?

**2.** Як звалі вялікага князя, які ўзначаліў барацьбу з рыцарамі-крыжакамі?

**3.** Раскажыце пра падзею, якая адбылася 15 ліпеня 1410 года.

**4.** Чаму беларускія, рускія, польскія, літоўскія і татарскія воіны перамаглі ў бітве пад Грунвальдам?

Пакажыце на карце «Вялікае Княства Літоўскае», што змешчана ў атласе, галоўныя напрамкі паходаў крыжакоў.


Правообладатель Издательский центр БГУ

# 15. ПА ЯКІХ ЗАКОНАХ ЖЫЛІ НАШЫ ПРОДКІ

У свеце існуюць розныя законы. Ёсць, напрыклад, законы прыроды. Сапраўды, чалавек не можа спыніць дождж ці снегапад, загадаць ветру не ламаць дрэвы і не разбураць дамы. Гэтыя законы незалежныя ад чалавека.

З цягам часу ў людзей з'явіліся свае законы. Яны былі заснаваны на правілах штодзённага жыцця. Напрыклад, вы і сёння ведаеце, што старэйшых трэба паважаць. Трэба любіць і шанаваць сваіх бацькоў, бабуль і дзядуляў, дапамагаць ім. Проста і зразумела, ці не так? А гэта і ёсць няпісаныя законы, якія выпрацавала само жыццё. Згодна з такімі законамі паважалі тых людзей, якія сумленна працавалі і добра ставіліся да іншых.

У часы Полацкага княства існаваў агульнанародны збор — ***ве́ча***. У вялікіх гарадах людзі збіраліся на галоўнай плошчы, каб разам прыняць закон ці важнае рашэнне. Пры галасаванні людзі не падымалі руку ўгору, як цяпер, а проста крычалі. За які закон крычалі мацней, той і прымаўся. Такія законы спачатку не запісваліся.

Першыя пісаныя законы ў Кіеўскай Русі былі аб'яднаны ў кнізе, якая называлася «Руская Праўда». Гэтыя законы падрыхтаваў Яраслаў Мудры.

Правообладатель Издательский центр БГУ



*Статут Вялікага Княства Літоўскага. 1588 год*



*Леў Сапега, адзін са складальнікаў Статута*

У 16 стагоддзі ў Вялікім Княстве Літоўскім з'явіўся адзін з першых у Еўропе збор законаў — ***Стату́т***. У ім вызначаліся правы і абавязкі ўсіх жыхароў Вялікага Княства Літоўскага — ад вялікага князя да селяніна. Згодна са Статутам усе дзяржаўныя органы і службовыя асобы павінны былі дзейнічаць адпаведна закону. Цікава, што ў Статуце нават пералічваліся віды звяроў і птушак, якія знаходзіліся пад абаронай дзяржавы. Статут быў напісаны на старабеларускай мове. Адным з яго складальнікаў стаў выдатны дзяржаўны дзе́яч *Леў Сапе́га*.


Правообладатель Издательский центр БГУ

Запісаныя ў кнігах законы, а таксама правілы паўсядзённага жыцця дапамагалі людзям жыць у міры і згодзе.

1. На чым былі заснаваны законы нашых продкаў?
2. Як называлася кніга першых пісаных законаў?
3. На якой мове быў напісаны Статут Вялікага Княства Літоўскага?
4. Назавіце імя і прозвішча выдатнага дзяржаўнага дзеяча, які стаў адным са складальнікаў Статута.

## 16—18. АДКУЛЬ ПАЙШЛІ НАЗВЫ НАШЫХ ГАРАДОЎ

Ужо ў 9—13 стагоддзях на тэрыторыі Беларусі існавалі буйны́я гарады. Гэта Полацк, Тураў, Мінск, Віцебск, Магілёў, Гомель, Брэст і Гродна. У кожнага з іх свой лёс, сваё жыццё. Давайце пазнаёмімся з гэтымі гарадамі.

**Полацк.** Самы старажытны горад — Полацк. Упершыню ён упамінаецца на старонках летапісу «Аповесць мінулых гадоў» пад **862 годам.**

Калі вы пабываеце ў Полацку, то ўбачыце вялікі горад. Ён размешчаны на рацэ Заход-

Правообладатель Издательский центр БГУ



*План старажытнага Полацка. Малюнак 16 стагоддзя*

няя Дзвіна ў тым месцы, дзе ў яе ўпадае рака Палата́.

Сюды некалі прыйшлі славяне, каб заснаваць тут новае паселішча. Ад рэчкі Палаты́ атрымалі назву першыя славянскія жыхары гэтых зямель — палачане.

Летапісы паведамляюць, што палачане плавалі нават у Чорнае мора. Полацкія гандляры былі вядомы далёка за межамі горада. Полацк часта наведвалі і замежныя купцы. Яны прадавалі свае тавары і куплялі тое, што выраблялі палачане. Слава аб Полацку разнеслася па ўсім свеце.


Правообладатель Издательский центр БГУ

**Тураў.** На беразе ракі Прыпяць размясціўся горад Тураў. Упершыню ён згадваецца ў «Аповесці мінулых гадоў» пад 980 годам.

Назва «Тураў», як мяркуюць гісторыкі, можа паходзіць ад імя князя, які быў уладаром у землях дрыгавічоў. Сваё імя Тур атрымаў ад распаўсюджанай у той час у Еўропе жывёлы — ту́ра (дзікага быка). Жыхары Турава расказваюць такое паданне пра ўзнікненне горада.

Даўным-даўно на месцы Турава былі дрымучыя, непраходныя лясы. Тут вадзілася шмат звяроў і птушак. У рэках плавала розная рыба. Завітаў сюды са сваім войскам князь Тур. Аднойчы, вельмі стомлены, прылёг ён адпачыць. І сніць князь, што ляжыць ён на высокім возе, а вакол — шмат гарадоў. Прачнуўшыся, князь Тур загадаў пабудаваць тут горад.

**Мінск.** У самым цэнтры Беларусі знаходзіцца яе сталіца — горад Мінск. А як ён узнік? Што тут было раней, у старажытныя часы? Упершыню Мінск упамінаецца ў летапісе пад **1067 годам** у сувязі з бітвай на рацэ Нямізе.

А адкуль жа ўзяла наша сталіца назву? Наконт гэтага ёсць розныя меркаванні.

Даўняе паданне гаворыць, што некалі на тым месцы, дзе пазней вырас горад, пасяліўся млынар. Да яго вазілі людзі збожжа, каб

Издательский центр БГУ



*Брама Мінскага замка*

перамалоць яго на муку. Некаторыя сталі сяліцца паблізу. Так узнікла паселішча. А млынара звалі *Ме́неск*. Адсюль нібыта і назва пайшла. Спачатку — Менеск, потым Менск, а яшчэ пазней — Мінск.

Ёсць іншая думка. Згодна з ёю заезджыя купцы быццам бы мянялі тут свае тавары на вырабы мясцовых майстроў. Таму пачатковая назва горада паходзіць ад слова «ме́на» — мяняць.

Большасць сучасных вучоных лічаць, што сваю назву наша сталіца ўзяла ад наймення рэчкі Ме́нкі. На яе берагах і пасяліліся нашы продкі. (Зараз рэчка амаль высахла.) Гэта


Правообладатель Издательский центр БГУ

рака была багатая на рыбу, якая звалася мень. Вось і атрымалася: Мень, Менка, Менеск, Менск і, нарэшце, Мінск.

**Віцебск.** Працягнем наша падарожжа. Калі ад Мінска мы будзем рухацца на паўночны ўсход, то прыедзем у горад Віцебск. Ён размясціўся на берагах Заходняй Дзвіны. Якраз тут з ёю злучаецца меншая рэчка — Ві́цьба. Ну, як не здагадацца, што горад узяў сваю назву ад гэтай рэчкі? Падобна таму, як ад Менкі — Менск, ці Мінск, так ад Віцьбы — Віцебск.

Паводле падання, аб якім згадваецца ў летапісе, Віцебск (або Ві́дбеск, Ві́цьбеск) быў заснаваны ў 974 годзе. Зручнае месцазнаходжанне на гандлёвым шляху «з варагаў у грэкі» спрыяла хуткаму развіццю горада.

**Магілёў.** Калі мы адправімся з вамі ў паўднёвым напрамку ад Мінска, то патрапім у горад Магілёў. Паўз яго таксама працягнулася сіняя стужка вялікай ракі. Гэта — Дняпро. Яго воды, узяўшы пачатак у Расіі, бягуць па землях Беларусі, потым Украіны аж да Чорнага мора.

Як бачым, нашы далёкія продкі ўмелі выбіраць зручныя мясціны для сваіх паселішчаў. Згодна з паданнем, Магілёў быў заснаваны ў 1267 годзе.

Як часта здаралася, усё пачалося з узвядзення княжацкага замка. Вакол замка, пад

Издательский центр БГУ

Правообладатель Издательский центр БГУ 



*Магілёўская ратуша*

абаронай яго, пачалі сяліцца людзі. Так паступова і ўзнік горад.

А вось гэтым разам назву горад узяў не ад ракі. Людская памяць данесла да нас цікавае паданне. У даўнія часы там, дзе стаіць цяперашні Магілёў, шумела векавая пушча. У самым яе гушчары, на беразе Дняпра, жыў *Машэ́ка*. Была ў яго нявеста, якую ён вельмі кахаў. Але князь сілком забраў прыгажуню ў свой замак. А да замка не падступіцца. Вось і ўзлаваўся Машэка на ўвесь свет.

Аднаго разу Машэка перахапіў на лясной дарозе багатую карэту. А ў ёй разам з князем ехала Машэкава нявеста. Машэка забіў князя, а каханую забраў з сабой. Але дзяўчына ўжо прывыкла да багатага жыцця ў князя. Яна дачакалася, калі Машэка засне, і забіла яго. Сябры пахавалі Машэку, а курган, які насыпалі над ім, назвалі «Магілай льва».



Правообладатель Издательский центр БГУ

Так гэта было ці не — хто ведае. Але адну з прыбярэжных гор, дзе некалі нібыта хаваўся Машэка, магілёўцы і цяпер называюць Машэ́каўкай.

**Гомель.** На поўдзень ад Магілёва размяшчаецца горад Гомель. Тут, на высокім беразе ракі Сож, некалі знаходзілася адно з самых старажытных паселішчаў радзімічаў. Пазней яно разраслося і ператварылася ў горад.




*Старажытныя гарады Беларусі*

Правообладатель Издательский центр БГУ

Кажуць, з даўніх часоў насупраць горада ўтварылася на рацэ вялікая мель. І людзі, сплаўляючы па Сажы́ лес у Дняпро, галасна папярэджвалі адзін аднаго: «Го-го, мель!» Гэта быццам бы і дало назву гораду.

У летапісах горад упершыню ўпамінаецца пад 1142 годам і называецца крыху інакш: Го́мін, Го́мій. Больш падобна на тое, што назва гэта звязана з ручаём *Гамяю́к*, які ўпадае тут у Сож. Аднак ці ручай запазычыў назву ў горада, ці наадварот — сказаць цяжка.

**Брэст.** А цяпер рушым на захад уздоўж Прыпяці і далей. Мы трапім у горад Брэст. Першыя летапісныя звесткі пра Брэст адносяцца да 1019 года. Ужо тады гэта быў важны гандлёвы цэнтр і моцная крэпасць.

Вось што кажуць пра паходжанне гэтага горада. Невядомы купец прабіраўся са сваім таварам праз палескія балоты і трапіў у непраходную дрыгву. Што рабіць? Здагадаўся ён абдзіраць бярозы і высціладь бяростаю шлях. Так і выратаваўся. Калі ж купец прадаў тавар і вяртаўся дадому, то спыніўся на гэтым месцы і прынёс ахвяры багам. А само месца ў гонар бяросты-выратавальніцы назвалі Бяре́сцем. Ад яго і сучасная назва — Брэст.

**Гродна.** Развітаўшыся са старажытным Брэстам, рушым уздоўж граніцы з Польшчай на поўнач. Ледзь не на самай мяжы з Літвой


Правообладатель Издательский центр БГУ




*Выгляд старажытнага Гродна*

мы трапім у горад Гродна. Па-даўнейшаму — Го́радзен, Гаро́дня. Гэтыя назвы, як і словы «гарадзішча», «горад», азначаюць «агароджанае месца, умацаванае паселішча».

Упершыню Гродна ўпамінаецца ў летапісе пад 1127 годам. Раскопкі сведчаць, што тут былі развіты розныя рамёствы. Горад меў гандлёвыя сувязі з іншымі старажытнымі гарадамі. Гэтаму спрыяла тое, што заснаваны ён быў на беразе Нёмана, які нясе свае воды ў Балтыйскае мора.

**Цікава ведаць**

**1.** Чым жа займаліся жыхары старажытных гарадоў? Кавалі́ выраблялі зброю, сякеры, сярпы, косы і іншыя рэчы, нават і такія, як іголкі, шылы, гузікі, за́сцежкі для адзення. Дзе яны бралі жалеза? Сёння

Издательский центр БГУ

і паверыць цяжка. Жалеза яны выплаўлялі з балотнай руды.

Гарбары вымочвалі ў рачной вадзе, а потым апрацоўвалі скуры. Шаўцы шылі з гэтых скур абутак. Цікава, што пры раскопках толькі некалькі разоў былі знойдзены лапці. Відаць, гараджане аддавалі перавагу ботам і чаравікам.

Не сядзелі склаўшы рукі і краўцы. Нельга ж чалавеку хадзіць без адзення.

Ганчары забяспечвалі жыхароў гліня́ным посудам. Ды хіба пералічыш усё, чым займаліся гарадскія майстры!

**2.** Пачынаючы з 14 стагоддзя беларускія гарады атрымлівалі права на самакіраванне. Першым такім горадам стаў Брэст, а потым — Гродна, Полацк, Мінск, Магілёў, Віцебск, Гомель. Кожны з гэтых гарадоў набыў свой герб.

? **1.** Калі ўпершыню на старонках летапісу згадваецца самы старажытны беларускі горад? Раскажыце, што вы ведаеце аб паходжанні яго назвы.

**2.** Як жыхары Турава тлумачаць паходжанне назвы свайго горада?

**3.** Раскажыце, адкуль узяліся назвы нашай сталіцы і абласных цэнтраў. Якія паданні з імі звязаны?



Правообладатель Издательский центр БГУ

4. Якімі справамі займаліся жыхары старажытных гарадоў?

1. Пакажыце на картасхеме «Старажытныя гарады Беларусі» (с. 67) напрамак нашага падарожжа па гарадах Беларусі.

2. Даведайцеся аб часе ўзнікнення і паходжанні назвы вашага населенага пункта. Падрыхтуйце вуснае паведамленне.

## 19. ПАД СЦЕНАМІ СТАРАЖЫТНЫХ ЗАМКАЎ

Нашы продкі будавалі замкі, каб абараніцца ад ворагаў. Слова «за́мак» падобна на слова «замо́к». На самай справе, старажытныя ўмацаванні былі сапраўднымі замка́мі, адамкнуць або падабраць ключы да якіх ворагам удавалася не заўсёды.

Найбольш магутныя замкі ўзводзіліся на граніцах у самых небяспечных месцах. Першапачаткова замкі будавалі з дрэва, а потым — з каменю і цэглы. Яны з’явіліся ў *Лі́дзе, Навагру́дку, Крэ́ве*.

Кожны замак меў свае асаблівасці. У Навагрудскага замка ў розныя часы было да сямі вежаў. Лідскі і Крэўскі замкі — амаль блізняты. Яны мелі форму чатырохвугольніка і па дзве вежы ў вуглах. Таўшчыня сцен дасягала трох метраў, вышыня — дванаццаці

Издательский центр БГУ



*Выгляд унутранай часткі замкавай вежы*

метраў, а даўжыня сцен складала чатырыста — пяцьсот метраў. Замкі былі акружаны ровам з вадою.


Правообладатель Издательский центр БГУ



*Сынковіцкая царква*

Цікавая і трагічная гісторыя звязана з Крэўскім замкам. Князь Яга́йла, які жадаў быць адзіным гаспадаром, падманам пасадзіў у падзямелле замка свайго брата — князя Ві́таўта. Выратавацца з няволі Вітаўту дапамагла жонка, якая наведала яго разам са служанкай. У час сустрэчы Вітаўт пераапрануўся ў адзенне служанкі, павязаўся хусткай і разам з жонкай пакінуў замак. Калі вартаўнікі ўбачылі падмену, яны са злосці забілі дзяўчыну. А Вітаўта сустрэлі верныя людзі, якія чакалі яго з асядланымі коньмі ва ўмоўленым месцы.

І вось князь Вітаўт імчыць па дарозе на поўдзень прэч ад Крэўскага замка. Паданне сведчыць, што шлях прывёў Вітаўта ў лясную вёску непадалёку ад Слоніма, дзе ён схаваўся ад пагоні. А пазней у знак удзячнасці мясцовым жыхарам Вітаўт загадаў пабудаваць тут царкву. Так з'явілася Сынко́віцкая


Правообладатель Издательский центр БГУ

царква-крэпасць, якая была адначасова і храмам, і абарончым збудаваннем. Яна і дагэтуль зачароўвае людзей сваёй суровасцю і прыгажосцю.

Згодна з загадам князя Вітаўта быў пабудаваны каменны замак у Гродне. Ён меў вельмі цікавую канструкцыю моста, якую вы можаце ўбачыць на старадаўняй карціне. Замак быў значна перабудаваны па загадзе Стафа́на Бато́рыя — караля *Рэ́чы Паспалі́тай*. Такую назву атрымала новая дзяржава, у якую ў **16 стагоддзі** ўвайшлі Вялікае Княства Літоўскае і Польскае каралеўства. У складзе гэтай дзяржавы знаходзіліся беларускія, украінскія, польскія і літоўскія землі.

У 16 стагоддзі былі пабудаваны замкі ў *Мі́ры, Нясві́жы, Гальша́нах*. Гальшанскі замак лічыўся адным з самых прыгожых. Казалі, што падобны на яго ёсць толькі ў Францыі.



*Гродзенскі замак. Фрагмент старадаўняй карціны*


Правообладатель Издательский центр БГУ



*Нясвіжскі замак*

Ён нечым нагадваў Мірскі замак, але выглядаў не так сурова. Гальшанскі замак захаваўся да нашых дзён у разбураным стане. Затое сёння адноўлены Мірскі замак.

Самым багатым і прыгожым з’яўляецца Нясвіжскі замак. Ён належаў старажытнаму роду князёў *Радзіві́лаў*. Тут былі сабраны цікавыя калекцыі рыцарскай зброі, каштоўных камянёў, манет, ікон і карцін, бібліятэка ў 20 тысяч кніг, розныя гістарычныя дакументы. Замак быў пабудаваны ўбаку ад горада, між азёр — фактычна на востраве.

Замкі — агульнанародная гордасць, бо хоць і належалі яны князям, але ж ствараліся ўсім народам, яго намаганнямі і талентам. У час навалы ўсе навакольныя жыхары ратаваліся ў замку. Абаранялі яго, а значыць, і сваю зямлю.

Правообладатель Издательский центр БГУ

**Цікава ведаць**

У 2010 годзе адбылося ўрачыстае адкрыццё аднаўленага Мірскага замка. У яго залах можна ўбачыць узоры мэблі, калекцыі старажытных зброі і музычных інструментаў, творы жывапісу і прадметы быту. Мірскі замкавы комплекс і Нясвіжскі палацава-замкавы комплекс унесены ў спіс Сусветнай спадчыны. А ў нашай краіне дзейнічае дзяржаўная праграма па аднаўленні старажытных замкаў Беларусі.



*Мірскі замак*

1. Адкуль паходзіць назва «замак»?
2. Для чаго будаваліся замкі? Дзе? З чаго?
3. Раскажыце, як князю Вітаўту ўдалося ўцячы з падзямелля Крэўскага замка.
4. Раскажыце, чым славутыя Мірскі і Нясвіжскі замкі.


Правообладатель Издательский центр БГУ

Пакажыце на карце «Архітэктурныя помнікі Беларусі», што змешчана ў атласе, замкі, пабудаваныя на землях Беларусі.

## 20. У КРАІНЕ МАЙСТРОЎ

У Нясвіжскім палацы Радзівілаў чакалі гасцей. Гаспадыня ўвайшла ў залу, дзе павінен быў адбыцца баль. Позірк яе міжволі спыніўся на высокіх сценах з люстэркамі ў пазалочаных рамах і падве́сных люстрах. З іх звісалі крышталёвыя гірлянды з кветак і лісця. Калі запальвалі ўсе свечкі, зала палымнела ад мноства фарбаў і святла.

Сэрца гаспадыні напоўнілася гордасцю, бо ўсё гэта былі вырабы са шкла беларускіх майстроў. Адзін з іх, Мікалай Дубіцкі, зрабіў вялікі шкляны ке́ліх, які дасягаў у вышыню



*Жырандоль (падсвечнік)*



*Шкляны келіх*

Правообладатель Издательский центр БГУ

амаль сямідзесяці сантыметраў. Гаспадыня палаца з задавальненнем аглéдзела вялікі стол, накрыты для прыёму гасцей. Не забылася глянуць і на вялікі келіх, які падымалі ў гонар асабліва паважанага госця.

Настаў час рыхтавацца да прыёму і гаспадару. Ён паклікаў да сябе слугу, які прынёс параднае адзенне. Погляд гаспадара затрымаўся на прыгожым шматколерным поясе, які пад сонечнымі прамянямі пераліваўся ўсімі колерамі вясёлкі. Успомніліся гаспадару іншаземныя шаўковыя паясы, якія прывозілі з замежных краін. І падумаў ён: а чаму не наладзіць вытворчасць такіх паясоў у сябе? Неўзабаве каля Нясвіжа з’явілася першая майстэрня па вырабе паясоў.

Праз некаторы час падобная майстэрня была заснавана ў Слуцку. Спачатку тут працавалі персідскія і турэцкія майстры. Яны перадалі свой вопыт мясцовым умельцам. Беларускія майстры ткалі ўзорыстыя слуцкія паясы з шаўковых, залатых і сярэбраных нітак.

Беларускі паэт Максім Багдановіч прысвяціў адзін са сваіх вершаў слуцкім майстрам:

Цямнее край зубчаты бору…
І тчэ, забыўшыся, рука
Заміж персідскага ўзору
Цвяток радзімы васілька.


Правообладатель Издательский центр БГУ



*Дзяўчына за кроснамі*

Магчыма, вам давядзецца пабываць на экскурсіі ў Нацыянальным музеі гісторыі і культуры Беларусі ў Мінску. Там вы можаце ўбачыць цуд — знакамітыя слуцкія паясы.

Правообладатель Издательский центр БГУ

Сёння ў Слуцку працуе фабрыка мастацкіх вырабаў. І на паясах, што вырабляюцца тут цяпер, можна ўбачыць узоры калісьці славутых слуцкіх паясоў.

**Цікава ведаць**

Беларускія майстры стварылі той тып пояса, які атрымаў назву «слуцкі пояс». Ён дасягаў больш чым двухметровай даўжыні. Паясы рабіліся з вельмі тонкай воўны. Пры шырыні каля сарака сантыметраў іх можна было працягнуць праз жаночы пярсцёнак. Слуцкія ткачы ўнеслі ў малюнак паясоў узоры, што былі найбольш блізь-



*Слуцкі пояс*



*Кафля*



Правообладатель Издательский центр БГУ

кія і родныя іх сэрцу. Да таго ж адзін пояс не паўтараў другі.

У 14—16 стагоддзях у Віцебску зарадзілася майстэрства каляровай ка́флі. Кафля — гэта гліняны выраб, які выкарыстоўваўся для абліцоўкі і ўпрыгожвання печаў. У 17 стагоддзі з'явілася кафля з выявамі людзей, жывёл, радавы́мі гербамі заможных людзей. У сённяшнім нашым жыцці таксама прысутнічае кафля. Толькі зараз яна выглядае прасцей і ўяўляе сабой керамічную плітку.

У нашай краіне знаходзіцца каля паўсотні паселішчаў з назваю Гу́та: Гу́тка, Гу́тніца, Новая Гута, Стара́я Гута, Сцюдзёная Гута і іншыя. Гэтыя назвы сведчаць аб развіцці шкляных фабрык. Шкляныя вырабы фабрыкі «Нёман», што на Гродзеншчыне, шырока вядомы ў Беларусі і за мяжой.

? **1.** Чаму Беларусь называлі краінай майстроў?

**2.** Адкажыце, чаму сэрца гаспадыні Нясвіжскага палаца поўнілася гордасцю.

**3.** Раскажыце пра гісторыю стварэння слуцкіх паясоў.

**4.** Як вы разумееце радкі верша Максіма Багдановіча: «І тчэ, забыўшыся, рука заміж персідскага ўзору цвяток радзімы васілька»?

Правообладатель Издательский центр БГУ

# 21. АД БАТЛЕЙКІ — ДА ТЭАТРА

У 16 стагоддзі людзі пачалі ствараць невялікія тэатры. Адным з такіх тэатраў быў народны лялечны тэатр — ***батле́йка***. Для паказаў батлейкі рабілі двухпавярховую скрынку памерамі паўтара на паўтара метра з гарызантальнымі ярусамі і дзверцамі замест вокнаў. Батле́ечнік рухаў лялькі, вымаўляў за іх словы. Іншы раз яму дапамагалі музыканты. Яны ігралі на дудках, цымбалах, скрыпках, бубнах, а пазней — на гармоніках.

Лялькі выраблялі з дрэва, тканіны, каляровай паперы. Валасы, бровы і ву́сы рабілі з лёну і аўчыны. Вопратку для лялек шылі з тканіны.

У ролі галоўных герояў выступалі Цар, Анёл, Баба, Мужык, Каза, Мядзведзь. А вось тых, каго ніколі не шанавалі ў народзе, — гультая, злодзея, хітрага гандляра — заўжды высмейвалі. Заўсёды з сімпатыяй успрымалі гледачы вобраз працавітага селяніна.

Батлеечнікі вандравалі па ўсёй краіне. Іх сустракалі як самых дарагіх гасцей. Асабліва радаваліся дзеці. Бо ў лялечным тэатры было столькі таямнічага і непаўторнага.

У 17 стагоддзі тэатры існавалі і ў школах. У горадзе Полацку пры адным з манастыроў манах-настаўнік *Сімяо́н* стварыў школьны тэатр. Разам з вучнямі Сімяон выступаў


Правообладатель Издательский центр БГУ



*Сімяон Полацкі*

нават перад маскоўскім царом, які прыехаў у Полацк.

А праз некалькі гадоў полацкага манаха запрасілі ў Маскву. Там ён стаў настаўнікам царскіх дзяцей. Сярод іх быў васьмігадовы хлопчык Пётр — будучы цар Пётр Першы.

Самога Сімяона ў Маскве пачалі называць *По́лацкім*. Тут ён адкрыў друкарню. Першай друкаванай кнігай стаў «Буквар», які Сімяон склаў сам. З удзелам Сімяона Полацкага пры двары рускага цара быў створаны прыдворны тэатр. У якасці акцёраў у ім выступалі нашы землякі.

Правообладатель Издательский центр БГУ



Лі́ра



Дуда́



Ражкі



Цымба́лы



Батлейка

Издательский центр БГУ

 Правообладатель Издательский центр БГУ



*Слонімскі тэатр Міхала Казіміра Агінскага*

У 18 стагоддзі тэатры сталі ўзнікаць у замках і палацах заможных людзей. Адным з такіх тэатраў быў тэатр Радзівілаў у Нясвіжы. Ён умяшчаў каля дзвюх тысяч гледачоў. Шырокую вядомасць набыў таксама Слонімскі тэатр *Мі́хала Казімі́ра Агі́нскага*. Тэатральная сцэна была падзелена на дзве часткі. На пярэдняй частцы можна было раз'язджаць на конях. Задняя частка магла запаўняцца вадой. Калі было трэба, на сцэну выплывалі лодкі і нават караблі. Музыкантамі, спевакамі, танцорамі ў тэатры былі пераважна таленавітыя беларускія сяляне.

Правообладатель Издательский центр БГУ



*Міхал Казімір Агінскі*



*Міхал Клеафас Агінскі*

У **канцы 18 стагоддзя** тэрыторыя Рэчы Паспалітай, у склад якой уваходзілі беларускія землі, была падзелена паміж іншымі краінамі. Беларускія землі былі ўключаны ў склад Расіі. А ў пачатку 19 стагоддзя пляменнік Міхала Казіміра Агінскага — *Мі́хал Клеафа́с Агі́нскі* напісаў славуты музычны твор — палано́з «Развітанне з Радзімай». Нават і сёння гэта адзін з папулярных музычных твораў, які чаруе сваёй прыгажосцю.

? 1. Што вы ведаеце пра батлейку?
2. Дзе Сімяон стварыў тэатр? Чаму Сімяона назвалі Полацкім?
3. Што ўяўляў сабой Слонімскі тэатр Міхала Казіміра Агінскага?
4. Назавіце імя аўтара паланэза «Развітанне з Радзімай». Пасля якой гістарычнай падзеі быў створаны гэты музычны твор?


Правообладатель Издательский центр БГУ

## 22. У ШТО ВЕРЫЛІ НАШЫ ПРОДКІ

Нашы продкі верылі ў розныя таямнічыя сілы, у існаванне добрых і злых духаў — лесуно́ў, ха́тнікаў, вадзяніко́ў. Пакланяліся Дажбо́гу — богу Сонца. Вельмі стараліся ўлагодзіць Перуна́ — бога грому і маланкі. Асаблівае значэнне надавалі Вяле́су — богу жывёлагадоўлі, гандлю і багацця.

Яшчэ ў тыя часы, калі жыла Рагнеда, на зямлю нашых продкаў прыйшла новая вера — хрысція́нства. Прынясце гэтай веры садзейнічала развіццю культуры. Пачалі будавацца цэрквы. Болей стала пісьме́нных людзей, бо пры цэрквах адчыняліся школы. Побач з цэрквамі будавалі манастыры.

Першы манастыр быў заснаваны Рагнедай каля Ізяслаўля, дзе яна і жыла. Сын Рагнеды Ізяслаў паклапаціўся аб адкрыцці ў Полацку першай школы. Ён пачаў збіраць бібліятэку. А пры жыцці Ефрасінні Полацкай у яе родным горадзе была пабудавана Спаса-Ефрасіннеўская царква.

У 11 стагоддзі хрысціянства падзялілася на праваслáўе і каталіцы́зм. Тыя, хто ходзіць у царкву, называюць сябе праваслáўнымі, а хто ў касцёл — каталіка́мі. Татары ходзяць у свае храмы — мячэ́ці, яўрэі — у сінаго́гі. Пераважная большасць ве́рнікаў у Беларусі — праваслаўныя.

Правообладатель Издательский центр БГУ



*Царква*



*Касцёл*



*Мячэць*



*Сінагога*


Правообладатель Издательский центр БГУ

З даўніх часоў жыхарам нашай зямлі ўласціва верацярпімасць.

Многім людзям і сёння вера ў Бога дапамагае ў зямным жыцці. Кожны чалавек сам выбірае сабе веру або застаецца няверуючым.

1. Раскажыце, якім старажытным багам пакланяліся нашы продкі.
2. Чаму прыняцце хрысціянства садзейнічала развіццю культуры?
3. Вернікі якіх рэлігій жывуць у Беларусі?
4. Як вы разумееце выраз «кожны чалавек сам выбірае сабе веру»?

Даведайцеся ў бацькоў ці настаўніка, вернікі якіх рэлігій жывуць у вашай мясцовасці.

## 23. ПЯСНЯР СЯЛЯНСКАЙ ДОЛІ

Няпроста жылося працоўнаму люду. З канца 15 стагоддзя сяляне сталі прыгоннымі. Яны не мелі вольнасці. Выконвалі прымусовыя абавязкі-павіннасці перад панамі. А ўсё чаму? Таму, што сяляне не валодалі зямлёй і належалі, як звычайныя рэчы, сваім панам.

У 1861 годзе было адменена заняволенне сялян. Сяляне даведаліся, што ім вяртаюцца воля і зямля. Яны станавіліся свабоднымі ад свайго пана. А пан страчваў права дарыць

Издательский центр БГУ

Правообладатель Издательский центр БГУ



*Сяляне працуюць на пана*

або прадаваць іх. Аднак зямлю сяляне маглі атрымаць толькі за вялікі грашовы выкуп. А дзе ж узяць грошы на выкуп зямлі? Як пражыць без зямелькі? Сяляне абураліся.

Абаронцам працоўнага люду стаў *Францíшак Багушэ́віч*, які нарадзіўся ў 1840 годзе. Дзяцінства яго прайшло сярод сялянскіх дзяцей. Скончыўшы ліцэй, ён працаваў абаронцам у судзе.

Багушэвіч заўсёды падтрымліваў просьбы сялян. Абараніць чалавечую годнасць мужыка ён спрабаваў і праз вершы. Яго паэтычныя радкі кранալі сэрца працоўнага люду, дапамагалі змагацца за лепшае жыццё.


Правообладатель Издательский центр БГУ

У зборніку вершаў «Дудка беларуская» Францішак Багушэвіч заклікаў беларускі народ берагчы і шанаваць родную мову.



*Францішак Багушэвіч*

Ён пісаў: «Братцы мілыя, дзеці Зямлі-маткі маёй! Вам ахвяруючы працу сваю, мушу з вамі пагаварыць трохі аб нашай долі-нядолі, аб нашай бацькавай спрадвечнай мове, каторую... „мужыцкай“ завуць, а завецца яна „беларускай“... Не пакідайце ж мовы нашай беларускай, каб не ўмёрлі!..»

Гэтыя словы служаць для нас запаветам і сёння.

І дагэтуль ляжыць каля дома, дзе жыў паэт, вялікі валун з выбітым на ім надпісам: «Памяці Маце́я Бурачка́». Так падпісваў свае кнігі Францішак Багушэвіч. А беларуская мова, як і руская, стала дзяржаўнай у Рэспубліцы Беларусь.

?

1. Хто такія прыгонныя сяляне?
2. Чаму прыгонным сялянам жылося няпроста?
3. Раскажыце, чаму сяляне абураліся, калі было адменена іх заняволенне.
4. Да чаго Францішак Багушэвіч заклікаў беларускі народ?

Правообладатель Издательский центр БГУ

# 24. СЛАВУТЫЯ ДЗЕЯЧЫ НАВУКІ І КУЛЬТУРЫ

Шмат зрабілі для развіцця беларускай культуры Кірыла Тураўскі, Ефрасіння Полацкая, Францыск Скарына, Сымон Будны, Сімяон Полацкі, Францішак Багушэвіч.

Не толькі ў Беларусі, але і за яе межамі шырока вядома імя даследчыка беларускай мовы і літаратуры, народных звычаяў і традыцый *Яўхі́ма Ка́рскага*.

Ён нарадзіўся ў 1860 годзе ў вёсцы Ла́ша, што на Гродзеншчыне. Вучоны сцвярджаў, што аснову беларускага народа склалі ўсходнеславянскія плямёны крывічоў, дрыгавічоў, радзімічаў. Сваю вялікую бібліятэку Карскі перадаў у Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт. Зараз яна знаходзіцца ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі.



*Яўхім Карскі*

У пачатку 20 стагоддзя моцна загучаў голас народных паэтаў Беларусі *Я́нкі Купа́лы* і *Яку́ба Ко́ласа*. Абодва былі равеснікамі, бо нарадзіліся ў 1882 годзе. Янка Купала — у вёсцы Вя́зынка, а Якуб Колас — у вёсцы Акі́нчыцы, што на Міншчыне. Абодва любілі родны край, сваю Айчыну і мову, свой



Правообладатель Издательский центр БГУ

 

*Вось такімі былі Янка Купала (злева) і Якуб Колас (справа) у пачатку свайго творчага шляху*

народ. У спадчыну нашчадкам яны пакінулі цудоўныя творы, якія часта друкаваліся ў беларускамоўнай газеце «Наша ніва».

Горда і сцвярджальна прагучалі словы Янкі Купалы ў вершы «А хто там ідзе?»:

А хто там ідзе, а хто там ідзе
У агрóмністай такой грамадзе?
— Беларусы...
А чаго ж, чаго захацелася ім,
Пагарджáным век, ім, сляпым, глухім?
— Людзьмі звацца.

А як пранікнёна і ў той жа час проста гучаць словы Якуба Коласа:

Мой родны кут, як ты мне мілы!..
Забыць цябе не маю сілы!..

Правообладатель Издательский центр БГУ



*Усевалад Ігнатоўскі*

Сёння мы заслужана называем народных паэтаў Беларусі Янку Купалу і Якуба Коласа вялікімі песнярамі зямлі беларускай. У іх мы вучымся любіць родную мову і сваю Бацькаўшчыну.

Вялікую ролю ў развіцці адукацыі і навукі Беларусі адыграла адкрыццё ў 1921 годзе першай вышэйшай навучальнай установы — *Белару́скага дзяржа́ўнага ўніверсітэ́та*. У 1922 годзе быў адкрыты *Інстыту́т белару́скай культу́ры*. У 1929 годзе ён быў пераўтвораны ў *Белару́скую Акадэ́мію наву́к*. Першым яе прэзідэнтам стаў вядомы гісторык *Усе́валад Ігнато́ўскі*. Сваё жыццё ён прысвяціў даследаванню важных падзей гісторыі Беларусі. Творы Усевалада Ігнатоўскага і сёння дапамагаюць нам вывучаць гісторыю Бацькаўшчыны.

Дасягненні беларусаў у развіцці навукі і культуры — гэта спадчына, якая выклікае павагу да нашай Радзімы ва ўсім свеце.

**Цікава ведаць**

У 19 стагоддзі браты *Канстанці́н* і *Яўста́фій Тышке́вічы*, якія нарадзіліся на Лагойшчыне, пачалі займацца вывучэн-


Правообладатель Издательский центр БГУ

нем гісторыі роднага краю. Не раз жыхары навакольных вёсак дзівіліся: з чаго б гэта маладыя паны, апрануўшыся па-простаму, ходзяць з хаты ў хату, да ўсяго прыглядаюцца і распытваюць пра старадаўнія звычаі? І запісваюць, запісваюць... А братоў цікавіла ўсё: як святкуюцца Каляды, Дзяды, Купалле, Радаўніца? Што засталося ад старых абрадаў? Якія песні спяваліся на святах?

Канстанцін і Яўстафій Тышкевічы пачалі раскопваць курганы. Яны шукалі старажытныя рэчы, зброю, посуд, прылады працы. Аднак у той час разбураць курганы лічылася вялікім грахом. Такога чалавека маглі і праклясці. Але ж браты не спынялі сваю працу. І мала хто з людзей разумеў, што браты Тышкевічы з'яўляюцца аднымі з заснавальнікаў беларускай археалогіі. Гэту навуку яшчэ называюць навукай з рыдлёўкай у руках.

Браты сталі таксама стваральнікамі Лагойскага музея старажытнасцей, аднаго з першых у Беларусі. Сюды яны перадалі багатую калекцыю знойдзеных у час раскопак матэрыялаў.

**1.** Раскажыце, што сцвярджаў вучоны Яўхім Карскі.

Издательский центр БГУ

Правообладатель Издательский центр БГУ

**2.** Што пакінулі нам у спадчыну Янка Купала і Якуб Колас? Што яны ўслаўляюць у сваіх творах? Пацвердзіце прыкладамі.
**3.** Пералічыце ўстановы, якія адыгралі вялікую ролю ў развіцці адукацыі і навукі Беларусі.
**4.** Назавіце імя і прозвішча першага прэзідэнта Беларускай Акадэміі навук.

## 25. БУДАЎНІЦТВА НОВАГА ЖЫЦЦЯ

Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі ў **1917 годзе** ў Беларусі была ўстаноўлена Савецкая ўлада. Рабочыя і сяляне пачалі будаваць новае жыццё. У **1919 годзе** была створана *Белару́ская Саве́цкая Сацыялісты́чная Рэспу́бліка* — БССР. Гэта незалежная дзяржава паклала пачатак самастойнаму жыццю беларускага народа. У **1922 годзе** БССР і іншыя савецкія рэспублікі аб'ядналіся ў адну вялікую дзяржаву — *Саю́з Саве́цкіх Сацыялісты́чных Рэспу́блік* (СССР). У Савецкім Саюзе нарадзіліся, выраслі і атрымалі адукацыю вашы бацькі, дзядулі і бабулі.

У складзе Савецкага Саюза працоўныя нашай краіны будавалі гарады, заводы, фабрыкі, электрастанцыі. Цяжка было першым будаўнікам і рабочым. Аднак людзей не пакідала надзея на лепшую будучыню. Дзя-


Правообладатель Издательский центр БГУ

куючы гераічнай, самаадданай працы беларускага народа і ўсіх народаў СССР у 1920—1930-я гады былі створаны прамысловыя прадпрыемствы. Яны і сёння выпрацоўваюць патрэбную для ўсіх людзей прадукцыю.

Патрэбы беларусаў у адзенні і тканінах задавальняюць швейныя і трыкатажныя фабрыкі. Яны былі пабудаваны ў Оршы, Віцебску, Магілёве. Паперу, кардон для кніг і сшыткаў вырабляе Добрушская папяровая фабрыка. Вам вельмі добра вядомы салодкія прысмакі, якія робяць на кандытарскіх фабрыках «Камунарка» ў Мінску і «Спартак»



*Першая беларуская электрастанцыя*

Издательский центр БГУ

у Гомелі. А згушчанае малако выпускаюць на Рагачоўскім кансе́рвавым заводзе.

Для развіцця прамысловасці спатрэбілася вялікая колькасць станкоў. Іх пачалі выпускаць на станкабудаўнічых заводах у Мінску, Віцебску, Гомелі. Для будаўніцтва гарадоў выкарыстоўвалася прадукцыя Гомельскага шклянога, Капыльскага кафельнага, Крычаўскага цэме́нтавага заводаў. Паспяхова працавалі запалкавыя фабрыкі ў Барысаве і Рэчыцы.

Галоўны працаўнік на зямлі — гэта чалавек. Для сумеснай працы ў вёсцы было вырашана стварыць калектыўныя гаспадаркі — калгасы. Гэта дазваляла калгаснікам зрабіць больш, чым аднаму селяніну. Калгаснікам дапамагалі працоўныя фабрык і заводаў. З горада ў вёску накіроўваліся трактары, камбайны і многа іншай сельскагаспадарчай тэхнікі. Яе пачалі вырабляць на заводзе ў Гомелі. У Беларускай акадэміі сельскай гаспадаркі былі падрыхтаваны тысячы аграномаў, жывёлаводаў, лесаводаў і іншых спецыялістаў.

Развівалася беларуская культура. У гарадах і вёсках будаваліся новыя школы, бібліятэкі, тэатры, музеі. Для працы на заводах і фабрыках патрабаваліся інжынеры і іншыя спецыялісты. Таму дзеці рабочых і сялян атрымалі магчымасць набываць веды ў вышэйшых навучальных установах.


Правообладатель Издательский центр БГУ

Дзяржаўнымі мовамі ў БССР у 1920—1930-я гады сталі беларуская, руская, яўрэйская, польская. А ўсё таму, што ў Беларусі жылі людзі розных нацыянальнасцей. Дружба дапамагала ім будаваць новае жыццё, развіваць гаспадарку і культуру нашай краіны.

**Цікава ведаць**

У пачатку 20 стагоддзя адбылася Першая сусветная вайна. Яна прынесла шмат разбурэнняў і бедстваў. З 1921 года тэрыторыя Заходняй Беларусі адышла да Польшчы. Жыццё жыхароў Заходняй Беларусі было нялёгкім. Лепшыя землі належалі польскім панам. А ўраджаі, што вырошчвалі беларускія сяляне, забіраў сабе пан. Азёры і лясы таксама належалі панам. Нават рыбакі на возеры Нарач не мелі права лавіць рыбу без дазволу мясцовага гаспадара.

У 1939 годзе адбылося далучэнне Заходняй Беларусі да БССР. Беларускі народ уз'яднаўся ў адзінай дзяржаве.

?

1. Як называліся дзяржавы, якія ўтварыліся ў 1919 і 1922 гадах?
2. Якіх поспехаў дасягнулі працоўныя БССР у развіцці народнай гаспадаркі?
3. Назавіце прадукцыю, якая выраблялася на прамысловых прадпрыемствах рэспублікі ў 1920—1930-я гады.

Издательский центр БГУ

**4.** Што змянілася ў жыцці сялян?
**5.** Якія мовы сталі дзяржаўнымі ў БССР у 1920—1930-я гады?

Пакажыце на карце «Рэспубліка Беларусь. Прамысловасць», што змешчана ў атласе, гарады, дзе ў 1920—1930-я гады былі пабудаваны буйны́я прамысловыя прадпрыемствы.

## 26—27. БЕЛАРУСЬ У ГАДЫ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ

Самыя жорсткія выпрабаванні выпалі на долю беларускага народа ў **1941—1945 гадах,** у час Вялікай Айчыннай вайны з нямецка-фашысцкімі захопнікамі. 22 чэрвеня 1941 года раніцай, калі людзі мірна спалі, нямецка-фашысцкія войскі раптоўна абрынулі на гарады і вёскі Беларусі і іншых савецкіх рэспублік тысячы снарадаў і бомб.

**Абаронцы Радзімы.** Першы ўдар ворага прынялі пагранічнікі і воіны *Брэ́сцкай крэ́пасці*. Амаль месяц мужна трымаліся яе абаронцы. Ужо быў узяты Мінск, фашысцкія танкі дасягнулі Смаленска. А ў глыбокім тыле ворага працягвалі змагацца пагранічнікі лейтэнанта *Андрэ́я Кіжава́тава*, салдаты маёра *Пятра́ Гаўры́лава*. На сценах крэпасці да нашага часу захаваўся надпіс, пакінуты яе


Правообладатель Издательский центр БГУ



*Абаронцы Брэсцкай крэпасці. Карціна мастака І. Ахрэмчыка*



*Галоўны ўваход у мемарыяльны комплекс «Брэсцкая крэпасць-герой»*

Издательский центр БГУ



*Мемарыяльны комплекс «Кацюша» ў Оршы*

абаронцамі: «Паміраю, але не здаюся. Бывай, Радзіма!»

Подзвіг абаронцаў Брэсцкай крэпасці стаў прыкладам мужнасці і адвагі, вернасці воінскаму абавязку. Абаронцы ішлі на подзвіг, не думаючы пра славу. Яны змагаліся за Радзіму. І так было на ўсіх франтах на працягу ўсёй вайны: у бітвах пад Масквой і Сталінградам, пад Курскам і на берагах Дняпра.

Самаахвярна змагаліся з гітлераўцамі франтавікі. У абарончых баях пад Оршай капітан *Іва́н Флёраў* камандаваў батарэяй рэактыўных мінамётаў — «Кацюш». Ужо ў наш час ён пасмяротна стаў Героем Расійскай Федэрацыі. У час Курскай бітвы лётчык *Алякса́ндр Гараве́ц* у адным з паветраных баёў збіў 9 варожых самалётаў. Але загінуў і сам. Яму было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.


Правообладатель Издательский центр БГУ




*Баявыя ўзнагароды: 1 — ордэн Айчыннай вайны; 2 — ордэн Славы; 3 — медаль «Партызану Айчыннай вайны»*

На тэрыторыі Беларусі, якая была захоплена ворагамі, разгарнулася сапраўдная народная вайна. У ёй удзельнічалі як дарослыя, так і дзеці. Аказваў дапамогу партызанам амаль стогадовы *дзед Тала́ш*.

Гераічна змагаўся з фашыстамі юны партызан *Мара́т Казе́й*. Яму было ўсяго чатырнаццаць гадоў. Апынуўшыся ў акружэнні ворагаў, Марат Казей адстрэльваўся да апошняга патрона. А потым гранатай падарваў сябе і варожых салдат, якія наблізіліся да яго.

Напярэдадні вайны прыехала ў Беларусь на канікулы пятнаццацігадовая школьніца з Ленінграда *Зі́на Партно́ва*. Апынуўшыся на захопленай ворагам Віцебшчыне, дзяўчына

Издательский центр БГУ
Правообладатель Издательский центр БГУ 

ўступіла ў арганізацыю «Юныя мсціўцы». Яна стала партызанскай разведчыцай. Пасля выканання аднаго з заданняў Зіну арыштавалі фашысты. У час допыту юная партызанка схапіла пісталет, што ляжаў на стале, і застрэліла свайго мучыцеля. Аднак збегчы ёй не ўдалося. Ворагі схапілі і закатавалі дзяўчыну. Пасмяротна Марату Казею і Зіне Партновай было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

Дзесяцігадовая дзяўчынка *Лю́ся Герасіме́нка* як магла дапамагала сваім бацькам весці барацьбу з ворагам. Яна дастаўляла важныя данясенні, расклейвала лістоўкі на сценах дамоў. Але фашысты высачылі Люсіну сям'ю. Люсю і яе маму арыштавалі. Дзяўчынка гераічна трымалася на допытах. Яна загінула, але не выдала ніводнага з тых, хто змагаўся з ворагам разам з яе бацькамі.

На чыгуначнай станцыі Орша патрыёты пад кіраўніцтвам *Канстанці́на Засло́нава* наладзілі выраб мін пад выглядам кавалкаў вугалю, якімі ўзрывалі паравозы. Затым заслонаўцы арганізавалі партызанскі атрад. Беларускія партызаны разгарнулі так званую «рэйкавую вайну». Яны пускалі пад адхон варожыя цягнікі, узрывалі рэйкі і чыгуначныя масты. У выніку фашысты панеслі вялікія страты. Канстанціну Заслонаву, які загінуў у час бою, было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

 Правообладатель Издательский центр БГУ

**Трывожныя званы.** Любоў да Бацькаўшчыны, чалавечая годнасць, нянавісць да захопнікаў заклікалі ісці ў бой супраць тых, хто жадаўператварыць нашу краіну ў лагер смерці за калючым дротам. У лагеры *Трасцянéц,* што пад Мінскам, за тры гады фашысты знішчылі 206 тысяч чалавек. Гэта значыць, кожныя 10 хвілін тут гінуў адзін чалавек.

На карце Беларусі вы не знойдзеце сёння назваў многіх даваенных вёсак. Яны былі спалены фашысцкімі захопнікамі ў час вайны разам з жыхарамі. Такая трагедыя адбылася ў вёсцы *Хаты́нь* у Лагойскім раёне. Гэта здарылася ў сакавіку 1943 года. У вёску ўварваліся фашысцкія салдаты. Яны сагналі ўсіх жыхароў у хлеў, зачынілі дзверы



*Мемарыяльны комплекс «Хатынь»*

Правообладатель Издательский центр БГУ

і падпалілі. Разам з людзьмі гарэлі і іх хаты. Фашысты загубілі 149 чалавек — дарослых, старых і дзяцей.

Сёння на месцы Хатыні — помнік. Там, дзе былі хаты, свечкамі стаяць коміны. А ўверсе на іх — званы. Трывожным звонам нагадваюць яны людзям аб жудаснай трагедыі тых 186 беларускіх вёсак, якія так і не аднавіліся пасля вайны. Не засталося жыхароў, якія маглі б паставіць новыя хаты, пасадзіць сады, вырасціць і навучыць дзяцей. За гады вайны было разбурана больш за 200 беларускіх гарадоў, спалена больш за 9 тысяч вёсак. Каля трох мільёнаў жыхароў Беларусі загінулі ў час Вялікай Айчыннай вайны. Калі ўшанаваць хвілінай маўчання кожнага, хто загінуў толькі ў нашай Беларусі, то мы маўчалі б чатыры гады.

**Вызваленне.** Летам 1944 года войскі Чырвонай Арміі пачалі канчатковае выгнанне ворага з Беларусі. Разам з салдатамі родную зямлю вызвалялі партызаны. Імкліва рушылі савецкія войскі да Мінска. Тут знаходзіліся вялікія сілы гітлераўцаў. Яны былі акружаны і знішчаны або ўзяты ў палон. 3 ліпеня 1944 года беларуская сталіца была вызвалена ад ворага. У тым месцы, дзе адбылося акружэнне фашысцкіх войскаў пад Мінскам, пасля вайны ўзняўся *Курга́н Сла́вы*. Ён сімвалізуе подзвіг і мужнасць савецкіх воінаў. Цяпер


Правообладатель Издательский центр БГУ



*Курган Славы Савецкай Арміі —*
*вызваліцельніцы Беларусі*

мы святкуем **3 ліпеня** як дзяржаўнае свята — *Дзень Незале́жнасці Рэспу́блікі Белару́сь (Дзень Рэспу́блікі)*.

У далёкім Берліне, за тысячы кіламетраў ад роднай зямлі, здзейсніў свой подзвіг воін-беларус *Тры́фан Лук’яно́віч*. У нейкі момант жорсткага бою нечакана стала ціха. У цішыні раптам пачуўся дзіцячы плач. Гэта была нямецкая дзяўчынка, маці якой загінула ў час бою. Наш зямляк папоўз да дзіцяці, забраў яго і паўзком накіраваўся да сваіх. Як толькі ён перадаў дзяўчынку сваім сябрам — грымнуў стрэл. Фашысцкая куля смяротна

Издательский центр БГУ

Правообладатель Издательский центр БГУ 

параніла адважнага воіна. У гонар гэтага подзвігу на берлінскай вуліцы, дзе загінуў Трыфан Лук'яновіч, стаіць памятны знак. А ў адным з паркаў Берліна пабудаваны цудоўны помнік.

**9 мая 1945 года** скончылася Вялікая Айчынная вайна. Таму гэты дзень мы святкуем як *Дзень Перамо́гі*.

1. Калі пачалася Вялікая Айчынная вайна?
2. Хто прыняў першы ўдар ворага на сябе?
3. Як адносіліся фашысцкія захопнікі да насельніцтва Беларусі? Раскажыце, якую трагедыю перажыла вёска Хатынь.
4. Прывядзіце прыклады подзвігаў нашых суайчыннікаў на франтах Вялікай Айчыннай вайны і на захопленай ворагам тэрыторыі Беларусі.
5. Раскажыце пра подзвіг Трыфана Лук'яновіча.
6. Патлумачце, чаму вайну 1941—1945 гадоў называюць Вялікай Айчыннай вайной.
7. Калі і чаму адзначаюць Дзень Перамогі?

1. Даведайцеся пра ўдзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны, якія жывуць у вашай мясцовасці.
2. Наведайце музей або выстаўку, прысвечаную падзеям Вялікай Айчыннай вайны. Апішыце адну з падзей гэтай вайны.


Правообладатель Издательский центр БГУ

# 28. БАГАЦЦЕ НАШАЙ КРАІНЫ

Пасля Вялікай Айчыннай вайны Беларусь апынулася ў вельмі цяжкім становішчы. Нашы гарады і вёскі, фабрыкі і заводы, школы і бальніцы былі разбураны і спалены. Многім людзям не было дзе жыць, не было чаго есці. Але мужны беларускі народ не паў духам. Колькі сіл і намаганняў трэба было прыкласці людзям, каб аднавіць і пабудаваць прамысловыя прадпрыемствы, узвесці жылыя дамы, вырасціць хлеб і выгадаваць жывёлу!

Галоўным у развіцці гаспадаркі стаў выраб машын. І сёння іх выпускаецца шмат



*Зборачны цэх Гомельскага завода сельскагаспадарчага машынабудавання*

Правообладатель Издательский центр БГУ




*Самазвал «БелАЗ»*

і самых разнастайных. Гэта грузавы і пасажырскі транспарт, тэхніка для сельскай гаспадаркі.

На дарогах свету можна бачыць шматтонныя грузавікі — прадукцыю беларускіх заводаў. Магутныя самазвалы аўтамабільнага завода ў Жодзіне — «БелАЗы» працуюць у кар'ерах па здабычы карысных выкапняў далёка за межамі рэспублікі. «МАЗы» Мінскага аўтамабільнага завода штодзень перавозяць шмат грузаў. Аўтобусы для перавозкі пасажыраў выпускаюць у Мінску і Лідзе. Тралейбусы, трамваі, матацыклы і веласіпеды — у Мінску. Шыны для машын вырабляюць у Бабруйску.

У многіх краінах вядомы трактар «Беларус». Ён выпускаецца ў Мінску. Гэты трактар універсальны, бо здольны выконваць розныя віды работ. Ён можа араць, баранаваць,


Правообладатель Издательский центр БГУ

сеяць, збіраць ураджай. А спатрэбіцца — перавязе ў сваім прычэпе любы груз. У гэтага трактара ёсць «малодшы брат» — трактар-«малютка». Ён дапамагае вяскоўцам апрацоўваць зямлю і перавозіць невялікія грузы. Гомельскія і лідскія камбайны збіраюць з палёў ураджай збожжа і іншых сельскагаспадарчых культур.

А колькі розных айчынных тавараў вакол нас: на рабоце, дома, у школе! Гэта тэлевізары, халадзільнікі, гадзіннікі, вылічальная і электронная тэхніка. Камп’ютарныя праграмы ствараюцца ў Парку высокіх тэхналогій. Шмат тавараў вырабляецца з дрэва: мэбля, будаўнічыя матэрыялы, папера, запалкі.



*Зборачны цэх Мінскага завода халадзільнікаў «Атлант»*

Правообладатель Издательский центр БГУ

Беларусь славіцца сваімі льнянымі, суконнымі і шаўковымі тканінамі, а таксама абуткам. У нашай краіне вырабляюць хімічныя валокны і ніткі, мінеральныя ўгнаенні, фарбы і лакі, пластмасы, медыцынскія прэпараты.

Сельская гаспадарка забяспечвае насельніцтва разнастайнымі прадуктамі харчавання. З чаго пякуць смачны, духмяны хлеб? Вядома, з жытняй мукі. А вось з пшаніцы атрымоўваюць муку для булак і пячэння, макаронных вырабаў. Акрамя жыта і пшаніцы ў Беларусі вырошчваюць ячмень, авёс, грэчку.

Важнае месца на нашых палях займае бульба. Яе нездарма завуць другім хлебам. З бульбы гатуюць мноства страў. Хто з вас не любіць, напрыклад, дранікі? Бульба таксама добры корм для жывёлы і сыравіна для іншых прадуктаў.

Блакітныя хвалі квітнеючага льну часцей за ўсё можна ўбачыць на поўначы рэспублікі. З-за гэтага яго завуць паўночным шоўкам. З валокнаў ільну вырабляюць ніткі, тканіну, абрусы, ручнікі, пасцельную бялізну. З семя льну выціскаюць але́й.

Жыхары краіны разводзяць кароў, свіней, коней, авечак, птушак. На корм свойскай жывёле вырошчваюць канюшыну, кукурузу, рапс, лубін, буракі і іншыя кармавыя культуры. З цукровых буракоў вырабляюць цукар.


Правообладатель Издательский центр БГУ



*Уборка ўраджаю*

Гаспадарка нашай краіны не можа існаваць без транспарту. Па чыгунцы, дарогах, рэках, трубаправодах, паветраным шляхам дастаўляецца сыравіна для прадпрыемстваў, перавозяцца вырабленыя з яе тавары і прадукты. Людзі карыстаюцца чыгункай, аўтамабілямі, а таксама трамваямі, аўтобусамі і тралейбусамі. Многія з вас ездзяць на веласіпедах, а дарослыя — на матацыклах. А мінчанам дапамагае скараціць час і адлегласць метро. З Нацыянальнага аэрапорта «Мінск» самалёты ажыццяўляюць палёты ў розныя куткі свету.

Правообладатель Издательский центр БГУ

1. Што выпрабляе прамысловасць нашай краіны?
2. Назавіце буйны́я прамысловыя прадпрыемствы ў Беларусі, якія выпускаюць вядомую ва ўсім свеце прадукцыю.
3. Раскажыце, якімі прадуктамі харчавання забяспечвае насельніцтва нашай краіны сельская гаспадарка.
4. Якім транспартам карыстаюцца жыхары нашай краіны?

1. Карыстаючыся картай «Рэспубліка Беларусь. Прамысловасць», што змешчана ў атласе, пакажыце транспартныя шляхі, якія праходзяць праз нашу краіну.
2. Даведайцеся, якую прадукцыю выпрабляюць у вашым населеным пункце. Дзе яна выкарыстоўваецца?

## 29. ТУТ МІНУЎШЧЫНА З СУЧАСНАСЦЮ СЫШЛІСЯ

Гарады зямлі беларускай... У кожнага з іх сваё непаўторнае аблічча, свая гісторыя. Адны славяцца старажытным мінулым, другія, наадварот, сучаснымі дасягненнямі. Колькі іх у нашай краіне? Больш за 100. Прыблізна столькі ж гарадскіх пасёлкаў. Вёсак — намнога больш, каля 24 тысяч. Аднак большая частка насельніцтва краіны пражывае


Правообладатель Издательский центр БГУ



*Лукомская электрастанцыя*

ў гарадскіх паселішчах — гарадах і гарадскіх пасёлках. Насельніцтва вёсак паступова змяншаецца. Расце насельніцтва гарадоў, болей становіцца і саміх гарадоў.

У сувязі з будаўніцтвам заводаў і асваеннем карысных выкапняў пачалі ўзнікаць новыя гарады. Сярод іх — Салігорск, Светлагорск, Наваполацк, Жодзіна, Новалукомль, Белаазёрск. Яны хутка растуць, прыгажэюць.

Правообладатель Издательский центр БГУ

Адзін з самых буйных маладых гарадоў — *Салігóрск*. Аб ім існуе такое паданне. Шмат горкіх слёз пралілі тут раней нашы продкі. Слязамі прамачылі зямлю. Глыбока ў зямлю зацяклі яны. І ўтварылася там з людскіх слёз салёнае мора. А потым ператварылася яно ў соль зямлі.

Салігорск узнік побач з залежамі калійных солей. Шахцёры сталі здабываць гэтыя падземныя багацці, а хімікі — перапрацоўваць калійныя солі ў мінеральныя ўгнаенні. Яны неабходны хлебаробам для таго, каб збіраць высокія ўраджаі.

*Навапóлацк* — горад хімікаў. Ён вырас побач са старажытным Полацкам на левым беразе Заходняй Дзвіны. Тут пабудавана вядомае на ўсю Беларусь і далёка за яе межамі прадпрыемства па перапрацоўцы нафты. Усім вам добра вядома поліэтыленавая плёнка. Гэта не толькі ўніверсальная ўпакоўка. Яе шырока выкарыстоўваюць і ў сельскай гаспадарцы.

Валакно нітрон, якое таксама выпускаецца на прадпрыемстве, ідзе на вытворчасць тканіны і трыкатажу, хімічна ўстойлівага адзення. Гэта валакно замяняе воўну.

Рэчывамі, якія атрымліваюць з нафты, Наваполацкі нафтаперапрацоўчы завод забяспечвае не толькі Беларусь, але і суседнія краіны.


Правообладатель Издательский центр БГУ
Издательский центр БГУ



*Наваполацкі нафтаперапрацоўчы завод*

Светлагорск, Новалукомль і Белаазёрск узніклі ў сувязі з будаўніцтвам электрычных станцый.

*Светлаго́рск* вядомы ў рэспубліцы як горад энергетыкаў і хімікаў. Ён вырас на рацэ Бярэзіне ў Гомельскай вобласці. Першымі тут з’явіліся будаўнікі. Узведзеная імі буйная электрастанцыя і завод штучнага валакна далі жыццё новаму гораду. Таму старажыламі ў горадзе лічацца энергетыкі і будаўнікі. А найбольш папулярнай стала прафесія хіміка. На заводзе штучнага валакна вырабляюць незвычайную тканіну — корд. Без яго немагчыма вытворчасць аўтамабільных

Правообладатель Издательский центр БГУ

і трактарных шын. Корд робіць іх больш трывалымі і даўгавечнымі.

Буйное прадпрыемства Светлагорска — цэлюлозна-кардонны камбінат. З драўніны і сабранай макулатуры тут вырабляюць кардон, паперу, цэлюлозу, разнастайныя хімічныя рэчывы.

Недалёка ад Мінска знаходзіцца горад *Жо́дзіна*. Там вырабляюць магутныя самазвалы, якія перавозяць шматтонныя грузы. Гасцей горада ўражвае манумент у гонар маці-патрыёткі *Наста́ссі Фамі́нічны Купрыя́навай*. Пяць яе сыноў абаранялі нашу Радзіму ў гады



*Манумент у гонар маці-патрыёткі ў Жодзіне*



Правообладатель Издательский центр БГУ

Вялікай Айчыннай вайны. Самы малодшы з іх — Пётр. У 1944 годзе пры вызваленні суседняй Латвіі ён закрыў сваім целам страляючы варожы кулямёт. Гэтым подзвігам юнак захаваў жыццё нашых воінаў. Мужнаму воіну *Пятру́ Купрыя́наву* пасмяротна прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

Калі вы станеце дарослымі, нашы гарады і вёскі будуць яшчэ лепшымі. Ужо зараз ствараюцца аграгарадкі, у якіх умовы жыцця людзей падобныя да гарадскіх. Вы пройдзеце па іх вуліцах, і вам самім захочацца зрабіць усё для таго, каб яны сталі яшчэ больш утульнымі, а наша зямля — прыгажэйшай.

**1.** Колькі гарадоў і вёсак у нашай краіне?
**2.** Як вы патлумачыце назвы новых гарадоў?
**3.** Раскажыце пра прафесіі жыхароў новых гарадоў у нашай краіне.
**4.** Што вырабляецца на прадпрыемствах, размешчаных у новых гарадах? Пры адказе выкарыстайце карту «Рэспубліка Беларусь. Прамысловасць», што змешчана ў атласе.

На палітыка-адміністрацыйнай карце атласа вызначце месцазнаходжанне гарадоў Салігорска, Светлагорска, Наваполацка, Жодзіна, Белаазёрска, Новалукомля. У якіх абласцях яны знаходзяцца?

Издательский центр БГУ

# 30. МІНСК — СТАЛІЦА НАШАЙ ДЗЯРЖАВЫ

Мінск — галоўны палітычны, гаспадарчы, культурны, навуковы цэнтр нашай рэспублікі. Гэта старажытны і адначасова малады горад. Яму больш за 900 гадоў. Гісторыя Мінска багатая і трагічная. Шмат разоў горад спусташалі і разбуралі ворагі. У час Вялікай Айчыннай вайны ён быў амаль увесь зруйнаваны. Але Мінск падняўся з попелу і руін. Нашай сталіцы было прысвоена званне «Горад-герой». За нядоўгі час Мінск ператварыўся ў адзін з буйнейшых гарадоў Еўропы.

«Варотамі» сталіцы называюць *Прывакза́льную плóшчу*. Пасля заканчэння вайны тут былі пабудаваны два будынкі, якія нагад-



*Прывакзальная плошча*



Правообладатель Издательский центр БГУ

ваюць вежы. На плошчы размешчаны чыгуначны вакзал і аўтавакзал «Цэнтральны». Гэта сучасныя будынкі, зробленыя з металу і шкла. Яны вылучаюцца сваёй зручнасцю і камфортам.

Сёння ў Мінску сотні вуліц і праспектаў. Цэнтральнай магістраллю з'яўляецца *праспе́кт Незале́жнасці*. Каля і ўздоўж яго размешчана шмат розных устаноў. Гэта Дом урада і рэзідэнцыя Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, Нацыянальная акадэмія навук Беларусі, навучальныя ўстановы, адноўлены будынак цырка, кінастудыя «Беларусьфільм». Праспект упрыгожвае арыгінальны дваццацітрохпавярховы будынак Нацыянальнай бібліятэкі. У ёй захоўваюцца мільёны кніг, часопісаў, рэдкіх выданняў. Каля будынка



*Рэзідэнцыя Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь*

Правообладатель Издательский центр БГУ



*Будынак Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі*



*Спартыўны комплекс «Мінск-Арэна»*



Правообладатель Издательский центр БГУ

бібліятэкі ўзведзены помнік беларускаму і ўсходнеславянскаму першадрукару Францыску Скарыне.

Ад старой часткі горада пачынаецца *праспéкт Перамóжцаў*. Па адным яго баку размяшчаюцца жылыя і грамадскія пабудовы, а па другім — сучасныя спартыўныя комплексы. Сярод іх — Палац спорту і крыты футбольны манеж. На беразе Камсамольскага возера, уздоўж якога працягнуўся праспект, знаходзіцца парк Перамогі і зона адпачынку для гараджан. Каля праспекта ўзведзены манумент «Мінск — горад-герой». Побач з ім узводзіцца будынак музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. Тут у святочныя дні адбываюцца парады, дэманстрацыі і канцэрты. На праспекце пабудаваны адзін з буйнейшых у Еўропе спартыўных комплексаў «Мінск-Арэна». У ім праходзіў фінал міжнароднага дзіцячага конкурсу Еўрабачання.

Побач з праспектам Пераможцаў пасярод ракі Свіслач знаходзіцца «Востраў мужнасці і смутку». У народзе яго называюць «вострavам слёз». Тут пабудавана капліца ў памяць нашых землякоў, якія загінулі ў войнах за межамі Беларусі. Ад праспекта Пераможцаў пачынаецца яшчэ адзін з цэнтральных праспектаў горада. Ён названы ў гонар Героя Савецкага Саюза, былога партызана, кіраўніка БССР *Пятрá Мірóнавіча Машэ́рава*.

Правообладатель Издательский центр БГУ



*«Востраў мужнасці і смутку»*



*Будынак Мінскай гарадской ратушы*



Правообладатель Издательский центр БГУ

Издательский центр БГУ

Памяць аб подзвігу народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны ўвекавечана ў назве *Партызáнскага праспéкта*. Побач з ім узведзены помнік беларускім партызанам. На Партызанскім праспекце размяшчаюцца буйны́я прамысловыя прадпрыемствы — аўтамабільны завод, велазавод.

Гасцей, якія наведваюць нашу сталіцу, прыемна ўражвае прыгажосць яе плошчаў.

Самая старажытная плошча ў горадзе — *плóшча Свабóды*. Тут адноўлены будынак гарадской ратушы, якая сведчыла аб наданні Мінску права на самакіраванне. На ратушы ўзвышаецца флюгер, размешчаны гадзіннік і герб горада. На плошчы і побач з ёй захаваліся помнікі 17—19 стагоддзяў. Прыгожай часткай сённяшняга Мінска стала гістарычнае *Трае́цкае прадмéсце*.



*Траецкае прадмесце*

Правообладатель Издательский центр БГУ



*Дом урада*

Самая вялікая і ўрачыстая — *пло́шча Незале́жнасці*. Тут знаходзяцца Дом урада, найбуйнейшыя навучальныя ўстановы краіны — Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт і Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка.

А далей па праспекце Незалежнасці — *Кастры́чніцкая пло́шча*. Тут узведзены велічны Палац Рэспублікі. Ёсць на плошчы знак «Нулявы кіламетр», які з'яўляецца пачаткам дарог Беларусі.

Свята захоўваецца ў нашай краіне памяць аб тых, хто аддаў сваё жыццё за нашу свабо-


Правообладатель Издательский центр БГУ




*Знак «Нулявы кіламетр» каля Палаца Рэспублікі*

ду. Гэтая памяць — у назвах праспектаў і вуліц, у помніку-танку каля Дома афіцэраў, у мануменце на *пло́шчы Перамо́гі*.

У гонар загінуўшых на плошчы Перамогі запалены Вечны агонь.

*Пло́шча Яку́ба Ко́ласа* ўзнікла на месцы, якое раней называлася Камароўкай. А зараз так мінчане называюць рынак. Цэнтральнае месца на плошчы займаюць помнік паэту — песняру роднай зямлі Якубу Коласу і скульптуры герояў яго твораў. Побач з плошчай — строгі будынак філармоніі, цэнтральны ўнівермаг «Мінск», паліграфічны камбінат, дзе

Правообладатель Издательский центр БГУ




*Плошча Перамогі*



*Плошча Якуба Коласа*

Издательский центр БГУ


Правообладатель Издательский центр БГУ

друкуюцца падручнікі для школ. А непадалёку знаходзіцца будынак былога прыборабудаўнічага завода, дзе да вайны працаваў Трыфан Лук'яновіч. У яго гонар на сцяне будынка размешчана памятная дошка, а адна з мінскіх вуліц носіць яго імя.

Назвы гарадскіх вуліц захоўваюць для нас памяць аб беларускіх паэтах Янку Купале і Максіме Багдановічу, удзельніку партызанскага руху дзеду Талашу і юным разведчыку Мараце Казею.

Мінск прыгожы не толькі ў цэнтры. Жыхарам горада патрэбна новае жыллё, школы, магазіны, зоны адпачынку. Таму на месцы былых вёсак узводзяцца новыя прыгожыя мікрараёны, пракладваюцца новыя вуліцы, будуюцца новыя станцыі метро. Горад добраўпарадкуецца і ўсё больш прыгажэе. Жыхары Беларусі любяць сваю сталіцу і ганарацца яе гістарычным мінулым і сучаснымі дасягненнямі.

? **1.** Чаму пра нашу сталіцу Мінск можна сказаць, што гэта старажытны і адначасова малады горад?
**2.** Раскажыце аб галоўных праспектах і плошчах сталіцы.
**3.** Складзіце кароткія вусныя апавяданні аб тых гістарычных асобах, імёны якіх носяць мінскія вуліцы і праспекты.

Правообладатель Издательский центр БГУ

**4.** Якія ўстановы і месцы для заняткаў і адпачынку дзяцей вядомы вам у Мінску? У якіх вам даводзілася пабываць?

Правядзіце ўмоўнае падарожжа па старажытнай частцы Мінска. Выкарыстайце картасхему «Панарама Мінска» ў канцы падручніка.

## 31. МАЯ РЭСПУБЛІКА

У **1991 годзе** была абвешчана незалежная і самастойная дзяржава — ***Рэспу́бліка Бела́русь***. СССР перастаў існаваць. 3 ліпеня ў нашай краіне адзначаецца як дзяржаўнае свята — Дзень Незалежнасці Рэспублікі Беларусь (Дзень Рэспублікі). Наша краіна ў 1991 годзе ўвайшла ў склад *Садру́жнасці Незале́жных Дзяржа́ў* (СНД).

У **1994 годзе** быў прыняты Асноўны Закон нашай дзяржавы — ***Канстыту́цыя*** Рэспублікі Беларусь. Кіраўніком нашай дзяржавы, згодна з Асноўным Законам, з'яўляецца ***Прэзідэ́нт*** Рэспублікі Беларусь. У 1994, 2001, 2006, 2010 гадах на гэту пасаду ў выніку ўсенароднага галасавання быў абраны *Аляксандр Рыго́равіч Лукашэ́нка*.

Паводле Канстытуцыі ўлада ў Рэспубліцы Беларусь належыць народу. Вышэйшым выбарным дзяржаўным органам з'яўляецца


Правообладатель Издательский центр БГУ



*Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь*
*Аляксандр Рыгоравіч Лукашэнка*

*Нацыяна́льны сход*. Беларускі народ ажыццяўляе сваю ўладу праз выбранне прадстаўнікоў-дэпутатаў у Нацыянальны сход. Яго дэпутаты распрацоўваюць і прымаюць законы нашай рэспублікі. Рашэнні па важных дзяржаўных пытаннях абмяркоўваюцца і прымаюцца на Усебеларускіх народных сходах і ўсенародных галасаваннях.

Усе дзяржаўныя органы, службовыя асобы, жыхары нашай краіны павінны выконваць законы. Усе людзі ў нашай дзяржаве — роўныя перад законам. Гэта значыць, яны маюць роўныя правы і абавязкі.

Издательский центр БГУ

Правообладатель Издательский центр БГУ 




*Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь*

Ажыццяўляе выкананне прынятых законаў ***Ура́д***. Яго назва — *Саве́т Міні́страў Рэспу́блікі Белару́сь*.

За тым, каб усе законы нашай дзяржавы адпавядалі Асноўнаму Закону — Канстытуцыі, сочыць *Канстытуцы́йны Суд Рэспу́блікі Белару́сь*.

Рэспубліка Беларусь прызнана краінамі свету як незалежная дзяржава. Наша краіна з **1945 года** з'яўляецца адной з заснавальніц Арганізацыі Аб'яднаных Нацый. Гэта самая значная міжнародная арганізацыя ў свеце. Яна заклікана забяспечваць мір на нашай планеце.


Правообладатель Издательский центр БГУ

Рэспубліка Беларусь адна з першых у свеце добраахвотна адмовілася ад ядзернай зброі і вывела яе са сваёй тэрыторыі. Гэта азначае наша імкненне вырашаць усе пытанні з іншымі дзяржавамі толькі мірнымі сродкамі.

Рэспубліка Беларусь падтрымлівае добрыя адносіны з суседзямі. 2 красавіка **1997 года** створаны *Саю́з Белару́сі і Расі́і*.

**2 красавіка** стала адзначацца ў абедзвюх дзяржавах як свята — Дзень яднання нашых народаў. У снежні 1999 года паміж нашымі краінамі быў падпісаны Дагавор аб стварэнні Саюзнай дзяржавы.

**1.** Як называецца наша дзяржава?
**2.** Як называецца Асноўны Закон нашай рэспублікі?
**3.** Каму належыць улада ў Рэспубліцы Беларусь?
**4.** Хто з'яўляецца кіраўніком нашай дзяржавы?
**5.** Калі адзначаецца Дзень Незалежнасці Рэспублікі Беларусь (Дзень Рэспублікі)?
**6.** Які дзяржаўны орган у нашай краіне распрацоўвае і прымае законы?

Пакажыце на палітыка-адміністрацыйнай карце атласа тэрыторыю нашай дзяржавы, месцазнаходжанне сталіцы і абласных цэнтраў.

Издательский центр БГУ

Правообладатель Издательский центр БГУ

# 32. ДЗЯРЖАЎНЫ ГЕРБ НАШАЙ КРАІНЫ

Кожная краіна мае свой ***герб***. Ён лічыцца галоўным ***сі́мвалам*** дзяржавы. Як выглядае Дзяржаўны герб Рэспублікі Беларусь?

Першае, на што зверне ўвагу кожны з вас, — гэта зялёны колер тэрыторыі нашай Радзімы. Так яна абазначана на геаграфічнай карце. Гэта тэрыторыя асвечана ззяннем залатых сонечных прамянёў, якія ўзыходзяць над блакітнай і зялёнай зямлёй. Такой убачылі яе з космасу гераічныя сыны беларускага народа касманаўты *Пётр Клімýк, Уладзі́мір Кавалёнак* і *Алéг Наві́цкі*. Выява зямнога шара на гербе нагадвае, што Рэспубліка Беларусь — адна з дзяржаў свету.

Яднанне Зямлі і Сонца — галоўны знак жыцця. Гэтыя выявы на гербе адлюстроўва-







*Касманаўты Пётр Клімук (злева), Уладзімір Кавалёнак (у цэнтры) і Алег Навіцкі (справа)*



Правообладатель Издательский центр БГУ




*Дзяржаўны герб Рэспублікі Беларусь*

юць традыцыі нашых продкаў, якія пакланяліся багіні-маці Зямлі і ўзыходзячаму Сонцу. Сімвалы Зямлі і Сонца азначаюць надзею сучасных людзей на росквіт Беларусі.

Пяціканцовая зорка на гербе — знак бяспекі і мужнасці. Прысутнасць зоркі азначае гатоўнасць кожнага жыхара да абароны сваёй Радзімы.

Абрамляе герб вянок са спелых каласоў жыта. Вянок абвіты чырвона-зялёнай стужкай з надпісам «Рэспубліка Беларусь». З аднаго боку вянок пераплецены ружовымі кветкамі канюшыны, а з другога — блакітнымі кветкамі льну. Вянок з даўніх часоў выкарыстоўваўся як узнагарода пераможцу.

Издательский центр БГУ

Такім чынам, герб нашай краіны — гэта запамінальная кніга-летапіс, якая апавядае пра беларускі народ і яго гісторыю.

Герб упрыгожвае будынкі органаў дзяржаўнай улады. Выява герба Рэспублікі Беларусь маецца на ўсіх дзяржаўных дакументах і пячатках.

? Апішыце герб Рэспублікі Беларусь па наступным плане:

1. Аб чым сведчыць зялёны колер тэрыторыі нашай краіны?
2. Знакам чаго з'яўляецца яднанне Зямлі і Сонца?
3. Што азначае зорка на гербе нашай краіны?
4. Сімвалам чаго служыць у выяве герба вянок са спелых каласоў жыта, пераплецены кветкамі канюшыны і льну?

## 33. СЦЯГ БЕЛАРУСКАЙ ДЗЯРЖАВЫ

У розных краінах — розныя сцягі. Іх гісторыя пачынаецца ў глыбокай старажытнасці. На працягу ўсёй нашай гісторыі паступова змяняўся і выгляд дзяржаўнага сцяга.

Пасля ўтварэння Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі дзяржаўным стаў чырвоны сцяг са скарочаным надпісам


Правообладатель Издательский центр БГУ



*Дзяржаўны сцяг Рэспублікі Беларусь*

назвы дзяржавы. Надпіс быў размешчаны ўверсе. Пазней да яго дабавілася выява сярпа і молата.

У 1945 годзе БССР стала адной з краін — заснавальніц Арганізацыі Аб'яднаных Нацый. Таму яе сцяг узняўся разам са сцягамі іншых краін-заснавальніц у амерыканскім горадзе Нью-Ёрку. У 1951 годзе на сцягу з'явілася ніжняя зялёная паласа, а таксама вертыкальная паласа з белым арнаментам на чырвоным фоне.

Сучасны Дзяржаўны сцяг Рэспублікі Беларусь таксама мае тры колеры: чырвоны, зялёны і белы.

Чырвоны колер са старажытных часоў служыць знакам Сонца. Ён сімвалізуе роднасць

Правообладатель Издательский центр БГУ

і братэрства. Чырвоны колер звязаны з барацьбой за свабоду і справядлівасць. Гэта знак перамогі і шчаслівага жыцця.

Зялёны колер — колер дабра і міру. Гэта колер прыроды, зялёнай раслiннасці палёў, лясоў, лугоў. Зялёны колер заўсёды азначаў вясновае абуджэнне прыроды пасля доўгага зімовага сну.

Белы колер — гэта перш за ўсё колер свабоды. Ён адлюстраваны ў назве нашай краіны — Беларусь. Белы колер таксама сімвалізуе духоўную чысціню і мудрасць жыхароў Беларусі. Гэтыя якасці захоўваюцца ў кожнага жыхара нашай Бацькаўшчыны.

Дзяржаўны сцяг Рэспублікі Беларусь мае яшчэ адну важную дэталь — чырвоны арнамент (узор з геаметрычных элементаў) на белым фоне. У яго аснове — народны ўзор, вышыты на ручніку. Гэты арнамент гаворыць пра любоў да працы нашага народа.

У цэнтры арнамента — ромб з «кручкамі», якія сімвалізуюць вечнасць і рух. Ромб — гэта старажытная выява багіні зямлі і ўрадлівасці. Ён азначае засеянае поле. Ромб таксама тлумачыцца як «ключ да шчасця». У беларускіх вышывальшчыц такі ромб называўся «сонейка». Яны звязвалі яго з узыходзячым чырвоным сонцам. Больш дробныя ромбы ўверсе і ўнізе арнамента сімвалізуюць ідэю вечнага жыцця.

 Правообладатель Издательский центр БГУ

Дзяржаўны сцяг Рэспублікі Беларусь пастаянна ўзняты над будынкамі, дзе размяшчаюцца органы дзяржаўнай улады. Ён сустракае нас на фабрыках і заводах, у воінскіх часцях і калгасах, у школах і вышэйшых навучальных установах. Дзяржаўны сцяг уздымаецца і ў час спартыўных спаборніцтваў.

У святочныя дні дзяржаўнымі сцягамі ўпрыгожваецца кожны населены пункт Беларусі. У Дзень Перамогі, 9 Мая, побач з імі знаходзяцца чырвоныя сцягі — сімвалы мужнасці нашага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны.

Кожную другую нядзелю мая ў нашай краіне святкуецца Дзень Дзяржаўнага герба і Дзяржаўнага сцяга. Гэтыя сімвалы нясуць пажаданне дабра, поспеху і працвітання ўсім жыхарам Беларусі.

Кожны з нас павінен з павагай ставіцца да дзяржаўных сімвалаў сваёй рэспублікі, бо гэта сімвалы нашай краіны і тых, хто ў ёй жыве.

**Цікава ведаць**

Чырвоны і зялёны колеры адлюстраваны ў самай высокай узнагародзе нашай рэспублікі — зорцы «Герой Беларусі». Першым Героем Беларусі стаў ваенны лётчык,

Издательский центр БГУ

Правообладатель Издательский центр БГУ 



*Першы Герой Беларусі*
*Уладзімір Карват*



*Зорка*
*«Герой Беларусі»*

падпалкоўнік *Уладзі́мір Карва́т*. У час вучэбнага палёту ў яго самалёце ўзнік пажар. Лётчык атрымаў каманду пакінуць пашкоджаную машыну. Аднак Уладзімір Карват вырашыў адвесці палаючы самалёт убок ад вёскі. Цаной уласнага жыцця ён выратаваў жыцці многіх людзей.

? **1.** Чым з'яўляюцца герб і сцяг для кожнай дзяржавы?
**2.** Што ўяўляе сабой сённяшні сцяг нашай дзяржавы? Апішыце яго.
**3.** Чаму трэба з павагай адносіцца да дзяржаўных сімвалаў нашай краіны?
**4.** Хто стаў першым Героем Беларусі? Раскажыце пра яго подзвіг.

Издательский центр БГУ

Правообладатель Издательский центр БГУ

# АБАГУЛЬНЯЮЧЫЯ ПЫТАННІ І ЗАДАННІ

Вы пазнаёміліся з гісторыяй нашай Радзімы, з гістарычным мінулым Бацькаўшчыны. У гэтай гісторыі было шмат гераічнага і трагічнага.

Што вам запомнілася? Што вас уразіла і што здзівіла? Чым вы можаце ганарыцца? Адкажыце на гэтыя пытанні і выканайце заданні.

**1.** Чаму мы называем нашу краіну Радзімай і Бацькаўшчынай? Адкуль пайшла назва нашай краіны?

**2.** Якія рэкі і азёры на тэрыторыі Беларусі звязаны з яе гістарычным мінулым?

**3.** Якія ўсходнеславянскія плямёны былі продкамі беларусаў?

**4.** Што вы ведаеце пра свой род, сваю сям'ю і іх жыццё? Падрыхтуйце вуснае паведамленне «Адкуль пачаўся мой род».

**5.** Назавіце гістарычныя падзеі, якія вам найбольш запомніліся. Пры адказе звяртайцеся да матэрыялу пад загалоўкам «Асноўныя гістарычныя даты».

**6.** Пералічыце імёны гістарычных асоб, дзеячаў навукі і культуры, якія найбольш вам запомніліся. Раскажыце пра аднаго з іх. Выкарыстайце карту «Славутыя людзі зямлі беларускай», што змешчана ў атласе.

Издательский центр БГУ

Правообладатель Издательский центр БГУ 

**7.** Якія легенды і паданні найбольш вам запомніліся? Перакажыце іх змест.

**8.** Якія помнікі пісьменнасці і літаратурныя творы пакінулі нам у спадчыну нашы продкі? Раскажыце, аб чым пісалася (паведамлялася) у іх. Хто з'яўляецца пачынальнікам кнігадрукавання сярод усходніх славян?

**9.** Раскажыце аб старадаўніх занятках жыхароў Беларусі. Выкарыстайце карту «Культура і рамёствы старадаўняй Беларусі», што змешчана ў атласе.

**10.** Чаму ў старажытнасці Беларусь называлі краінай замкаў? З якімі замкамі вы пазнаёміліся ў час сваіх падарожжаў? Якія гісторыі пра замкі вы ведаеце?

**11.** Паглядзіце на карту нашай краіны і назавіце вядомыя вам гарады. Які з іх самы старажытны? Якія гарады з'явіліся на карце нашай рэспублікі нядаўна? Адкуль пайшлі назвы нашай сталіцы і абласных цэнтраў? А як тлумачыцца назва вашага населенага пункта?

**12.** Якой была вера нашых продкаў? Як адносяцца адзін да аднаго вернікі, што пражываюць у нашай краіне?

**13.** Якія выпрабаванні выпалі на долю нашага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны? Прывядзіце прыклады гераізму беларускага народа.


Правообладатель Издательский центр БГУ

Издательский центр БГУ

**14.** Па якіх законах жылі нашы продкі? Як называецца Асноўны Закон нашай рэспублікі?

**15.** Раскажыце, якімі прамысловымі вырабамі і сельскагаспадарчай прадукцыяй славіцца наша краіна і ваша мясцовасць. Выкарыстайце карты «Рэспубліка Беларусь. Прамысловасць» і «Рэспубліка Беларусь. Сельская гаспадарка», што змешчаны ў атласе.

**16.** Як называецца наша дзяржава? Каму належыць улада ў ёй?

**17.** Апішыце дзяржаўныя сімвалы нашай рэспублікі.

**18.** Якія кнігі пра гісторыю Беларусі вы чыталі? Аб чым у іх апавядаецца?

**19.** Адкажыце, чаму нас вучыць гісторыя. Навошта яе трэба ведаць?

Издательский центр БГУ

Правообладатель Издательский центр БГУ

# ПАВАЖАНЫЯ ВУЧНІ!

Завяршаецца вучэбны год. Вы добра папрацавалі па падручніку «Чалавек і свет. Мая Радзіма — Беларусь», шмат даведаліся пра нашу краіну. Вы можаце ганарыцца сваёй прыгожай і шчодрай зямлёй, яе багатай гісторыяй.

Мы — народ Беларусі. Наша гісторыя пачынаецца ў далёкай мінуўшчыне. Мы жывём у Еўропе побач з рознымі іншымі народамі, у якіх таксама свая гісторыя. Але перш за ўсё мы павінны ведаць сваё мінулае. Для таго, каб зразумець, хто мы ёсць, адкуль ідзём і куды хочам прыйсці. А яшчэ для таго, каб прадоўжыць справу продкаў, якія прысвяцілі сваё жыццё росквіту роднай Беларусі!

Издательский центр БГУ

Правообладатель Издательский центр БГУ

# ГІСТАРЫЧНЫ СЛОЎНІК

***Батле́йка*** (с. 82) — народны лялечны тэатр.

***Ба́цькаўшчына*** (с. 5) — для кожнага чалавека краіна, дзе нарадзіўся ён сам і яго продкі.

***Ве́жа*** (с. 32) — высокае абарончае збудаванне з дрэва ці цэглы.

***Ве́ча*** (с. 59) — старажытны народны сход, які збіраўся для вырашэння важных пытанняў.

***Во́лат*** (с. 26) — дужы і высокі чалавек.

***Герб*** (с. 134) — сімвал (знак) дзяржавы.

***Гісто́рыя*** (с. 6) — навука, якая расказвае пра жыццё і справы нашых продкаў.

***Да́та*** (с. 22) — час, калі адбылася падзея.

***Дзяды́*** (с. 27) — восеньскі дзень памяці продкаў.

***Дзяржа́ва*** (с. 6) — саюз грамадзян, утвораны з мэтай абароны іх жыцця, свабоды, маёмасці.

***Дружы́на*** (с. 46) — асабістае войска князя.

***Зако́н*** (с. 43) — абавязковыя правілы паводзін, устаноўленыя дзяржавай.

***Канстыту́цыя*** (с. 130) — Асноўны Закон дзяржавы.

***Князь*** (с. 40) — спачатку кіраўнік племені, а потым — княства.

***Курга́н*** (с. 25) — земляны насып над старажытным пахаваннем.

Правообладатель Издательский центр БГУ

***Ледаві́к*** (с. 24) — лёд, які пакрываў зямную паверхню ў далёкія часы.

***Лéтапіс*** (с. 28) — рукапісная кніга, у якой штогод (кожнае лета) запісваліся звесткі аб гістарычных падзеях.

***Падáнне*** (с. 11) — апавяданне пра справы і ўчынкі чалавека, пра заняткі нашых продкаў.

***Плéмя*** (с. 10) — група людзей, якія маюць агульных продкаў, мову, месца пражывання.

***Прóдкі*** (с. 5) — людзі, ад якіх мы вядзём сваё паходжанне.

***Прэзідэ́нт*** (с. 130) — выбарны кіраўнік дзяржавы.

***Рáдаўніца*** (с. 27) — дзень шанавання памяці продкаў, які адзначаецца вясной.

***Радзі́ма*** (с. 5) — краіна, у якой чалавек нарадзіўся.

***Ры́цар*** (с. 55) — цяжкаўзброены конны воін.

***Рэспу́бліка Белару́сь*** (с. 6, 130) — незалежная і самастойная дзяржава беларускага народа, якая абвешчана ў 1991 годзе.

***Сабóр*** (с. 45) — галоўная царква ў горадзе.

***Сі́мвал*** (с. 134) — знак.

***Стату́т*** (с. 60) — збор законаў у Вялікім Княстве Літоўскім.

***Стая́нка*** (с. 23) — месца жыхарства старажытных людзей.


Правообладатель Издательский центр БГУ

***Ура́д*** (с. 132) — вышэйшы дзяржаўны орган краіны, які арганізуе выкананне прынятых законаў.

***Э́ра*** (с. 22) — працяглы адрэзак часу, звычайна большы за тысячагоддзе.

## АСНОЎНЫЯ ГІСТАРЫЧНЫЯ ДАТЫ

**Каля 24 тысяч гадоў да нашай эры** — з'яўленне на тэрыторыі Беларусі першых стаянак першабытных жыхароў.

**862 год** — першае летапіснае ўпамінанне пра Полацк.

**9—12 стагоддзі** — існаванне Полацкага княства, старажытнарускай дзяржавы Кіеўскай Русі.

**11 стагоддзе** — будаўніцтва ў Полацку Сафійскага сабора, княжанне Усяслава Чарадзея.

**1067 год** — бітва на рацэ Нямізе. Першыя звесткі ў летапісе пра Мінск.

**12 стагоддзе** — жыццё і дзейнасць Ефрасінні Полацкай і Кірылы Тураўскага.

**13 стагоддзе** — утварэнне Вялікага Княства Літоўскага.

**1410 г.** — Грунвальдская бітва.

**1517 г.** — пачатак кнігадрукавання Францыскам Скарынам.

Правообладатель Издательский центр БГУ

**16 стагоддзе** — дзейнасць Сымона Буднага. Выданне Статута Вялікага Княства Літоўскага.

**16 стагоддзе** — аб'яднанне Вялікага Княства Літоўскага і Польскага каралеўства ў складзе Рэчы Паспалітай.

**Канец 18 стагоддзя** — уваходжанне беларускіх зямель у склад Расіі.

**1917 год** — Кастрычніцкая рэвалюцыя.

**1919 год** — утварэнне Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі (БССР).

**1922 год** — стварэнне Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік (СССР).

**1941—1945 гады** — Вялікая Айчынная вайна.

**9 мая 1945 года** — Дзень Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне.

**1945 год** — удзел Беларусі ў заснаванні Арганізацыі Аб'яднаных Нацый (ААН).

**1991 год** — утварэнне Рэспублікі Беларусь.

**3 ліпеня** — Дзень Незалежнасці Рэспублікі Беларусь (Дзень Рэспублікі).

**1994 год** — прыняцце Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь. Абранне першым Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь А. Р. Лукашэнкі.

**1997 год** — утварэнне Саюза Беларусі і Расіі.

**2 красавіка** — Дзень яднання народаў Беларусі і Расіі.


Правообладатель Издательский центр БГУ

# ЗМЕСТ

Як працаваць з падручнікам .................. 3

1. Беларусь — мая Радзіма .................. 5
2. Мы і нашы суседзі .................. 7
3. Нашы продкі .................. 9
4. Зямля блакітных рэк і азёр .................. 14
5. Наша Радзіма на гістарычнай карце ... 19
6. Стужка часу .................. 21
7. Маўклівыя сведкі мінуўшчыны ........ 24
8. Як да нас прыйшла кніга .................. 28
9. Першыя друкаваныя кнігі .................. 33
10. Князёўна з трыма імёнамі .................. 38
11. Сын Рагнеды — Яраслаў Мудры ........ 43
12. Усяслаў Чарадзей .................. 46
13. Ефрасіння Полацкая .................. 50
14. У абарону сваёй зямлі .................. 55
15. Па якіх законах жылі нашы продкі ... 59
16—18. Адкуль пайшлі назвы нашых гарадоў .................. 61
19. Пад сценамі старажытных замкаў ..... 71
20. У краіне майстроў .................. 77
21. Ад батлейкі — да тэатра .................. 82
22. У што верылі нашы продкі .................. 87
23. Пясняр сялянскай долі .................. 89
24. Славутыя дзеячы навукі і культуры ... 92
25. Будаўніцтва новага жыцця .................. 96
26—27. Беларусь у гады Вялікай Айчыннай вайны .................. 100

Правообладатель Издательский центр БГУ

28. Багацце нашай краіны .................. 109
29. Тут мінуўшчына
з сучаснасцю сышліся.......................... 114
30. Мінск — сталіца нашай дзяржавы.... 120
31. Мая рэспубліка................................ 130
32. Дзяржаўны герб нашай краіны ........ 134
33. Сцяг беларускай дзяржавы ............. 136

Абагульняючыя пытанні і заданні......... 141
Гістарычны слоўнік ............................ 145
Асноўныя гістарычныя даты ................ 147

Издательский центр БГУ

Правообладатель Издательский центр БГУ

(Назва і нумар школы)

| Навучальны год | Імя і прозвішча вучня | Стан падручніка пры атрыманні | Адзнака вучню за карыстанне падручнікам |
|---|---|---|---|
| 20 / 20 | | | |
| 20 / 20 | | | |
| 20 / 20 | | | |
| 20 / 20 | | | |
| 20 / 20 | | | |
| 20 / 20 | | | |

Издательский центр БГУ

Правообладатель Издательский центр БГУ

Ч-16 **Чалавек** і свет. Мая Радзіма — Беларусь : падруч. для 4-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / С. В. Паноў [і інш.]. — 2-е выд., дап. і выпр. — Мінск : Выд. цэнтр БДУ, 2013. — 151 с. : іл.
ISBN 978-985-553-064-1.

Першае выданне выйшла ў 2007 г. пад назвай «Мая Радзіма — Беларусь».

**УДК 974.6(075.2=161.3=161.1)**
**ББК 63.3(4Беи)я721**

---

Вучэбнае выданне

**Паноў** Сяргей Веніямінавіч
**Тарасаў** Сяргей Васільевіч
**Гімпель** Ірына Андрэеўна і інш.

**ЧАЛАВЕК І СВЕТ.**
**МАЯ РАДЗІМА — БЕЛАРУСЬ**

**Падручнік для 4 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання**

2-е выданне, дапоўненае і выпраўленае

Галоўны рэдактар *Т. Я. Янчук*
Мастакі *Ю. В. Качаргіна, В. А. Рэднікіна*
Тэхнічнае рэдагаванне і камп'ютарная вёрстка *К. У. Раманчык*
Карэктары *Т. М. Булатава, В. М. Іваноў, Н. Б. Кучмель*

У падручніку змешчаны фотаздымкі *В. Б. Атапіна, Дз. П. Сіняўскага*.
На форзацы выкарыстаны фрагмент картасхемы «Панарама Мінска» мастака *Р. У. Атаяна* (ТАА «Квадрограф»).

Падпісана ў друк 20.12.2012. Фармат 60×90 1/16. Папера афсетная № 1.
Друк афсетны. Ум. друк. арк. 9,5 + 0,25 форз. Ул.-выд. арк. 6,14 + 0,41 форз.
Тыраж 127 500 экз. Заказ

Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства
«Выдавецкі цэнтр Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта».
ЛИ № 02330/0494361 ад 16.03.2009. Вул. Чырвонаармейская, 6, 220030, Мінск.

ААТ «Паліграфкамбінат імя Я. Коласа».
ЛП № 02330/0150496 ад 11.03.2009. Вул. Каржанеўскага, 20, 220024, Мінск.

Издательский центр БГУ
Правообладатель Издательский центр БГУ